ПРЫВЕТ ВАМ, ПЛЕМЯ МАЛАДОЕ, ЗЯМЕЛЬ САВЕЦКІХ ЯСНАЦВЕТ!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 86 (2252)
29 кастрычніка 1968 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НА КАСМІЧНАЙ АРБІЦЕ—«САЮЗ-3»

Савецкая навука і тэхніка атрымалі новую перамогу. 26 кастрычніка ў 11 гадзін 34 мінуты па маскоўскаму часу на арбіту штучнага спадарожніка Зямлі магутнай ракетай-носьбітам выведзен касмічны карабель «Саюз-3». Карабель пілатуе грамадзянін Савецкага Саюза лётчык-касманаўт, Герой Савецкага Саюза, заслужаны лётчык-выпрабавальнік СССР, палкоўнік Георгій Цімафеевіч Берагавой.

Чацвёртыя суткі ўвесь свет з вялікай увагай сочыць за палётам савецкага касмічнага карабля «Саюз-3». Лётчык-касманаўт Георгій Берагавой паспяхова выконвае намечаную праграму навуковых даследаванняў і эксперыментаў.

Касманаўт Г. Ц. Берагавой.

УСЕСАЮЗНАМУ ЛЕНІНСКАМУ КАМУНІСТЫЧНАМУ САЮЗУ МОЛАДЗІ

Цэнтральны Камітэт КПСС горача віншуе камсамольцаў, усю савецкую моладзь са знамянальным святам — 50-годдзем Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі.

Камуністычны Саюз Моладзі, створаны па ініцыятыве нашага вялікага правадыра і настаўніка Уладзіміра Ільіча Леніна, быў і застаецца актыўным памочнікам і баявым рэзервам Камуністычнай партыі. Увесь гераічны шлях камсамола непарыўна звязан з гісторыяй нашай вялікай сацыялістычнай Радзімы, з барацьбой рабочага класа, савецкага народа пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі за перамогу сацыялізма і камунізма.

Ленінскі камсамол згуртоўвае вакол партыі шырокія масы савецкай моладзі, дапамагае ідэйна выхоўваць стойкіх і перакананых барацьбітоў за шчасце працоўнага народа. За пяцьдзесят гадоў у радах ВЛКСМ атрымалі ідэйную загартоўку, першы вопыт арганізатарскай і грамадскай работы каля ста мільёнаў савецкіх людзей.

Ордэны Савецкага Саюза на чырвоным сцягу Ленінскага камсамола—яскравае сведчанне таго, як высока ацэньваюць партыя, урад і народ баявы і працоўны ўклад савецкай моладзі ў вялікія дасягненні нашай Радзімы.

Пад кіраўніцтвам партыі камсамол самаадданa і мужна змагаўся за ўстанаўленне і ўмацаванне Савецкай улады, за паспяховае ажыццяўленне індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і задач культурнага будаўніцтва.

Яркай старонкай у летапіс Ленінскага камсамола ўвайшоў актыўны ўдзел савецкай моладзі ў выкананні планаў першых пяцігодак, узвядзенні гігантаў сацыялістычнай індустрыі — Днепрагэса, Магніткі, Уралмаша, у будаўніцтве буйнейшых прамысловых цэнтраў Сібіры, Поўначы, Далёкага Усходу і іншых раёнаў краіны, горада юнацтва Камсамольска-на-Амуры.

Радзіма не забудзе масавага гераізму моладзі на франтах і ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны. За подзвігі на палях бітваў больш як сем тысяч выхаванцаў камсамола ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, тры з палавінай мільёны—узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР.

Верныя ленінскім запаветам, камсамольцы і моладзь 60-х гадоў свята захоўваюць і прымнажаюць баявыя і працоўныя традыцыі савецкага народа, самаадданa працуюць над вырашэннем велічных залач, выстаўленых Праграмай КПСС і рашэннямі XXIII з'езда партыі. І сёння савецкі народ з удзячнасцю адзначае актыўны ўдзел моладзі ў будаўніцтве гігантаў сучаснай прамысловасці і энергетыкі, сталёвых магістралей, ва ўздыме сельскай гаспадаркі, асваенні новых зямель, у паляпшэнні гандлю, камунальнага і бытавога абслугоўвання насельніцтва, у развіцці айчыннай навукі і тэхнікі.

Камсамольцы—юнакі і дзяўчаты—разам з камуністамі выступаюць ініцыятарамі сацыялістычнага спаборніцтва і руху за камуністычную працу, змагаюцца за датэрміновае выкананне пяцігадовага плана, за павышэнне эфектыўнасці сацыялістычнай вытворчасці.

Вялікую школу жыцця, патрыятычнай загартоўкі праходзіць моладзь у радах Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Тут яна атрымлівае трывалыя ваенныя веды, асвойвае складаную сучасную тэхніку, набывае баявы вопыт. Маладыя воіны разам са сваімі старэйшымі таварышамі па зброі пільна сочаць за падкопамі імперыялістаў, у любую мінуту гатовы стаць на абарону заваёў Вялікага Кастрычніка.

Аб'ядноўваючы ў сваіх радах юнакоў і дзяўчат усіх нацыянальнасцей нашай краіны, камсамол выхоўвае іх у духу любві і адданасці сацыялістычнай Радзіме, у духу камуністычнай ідэйнасці, дружбы народаў і пралетарскага інтэрнацыяналізму. Гордасць за сацыялістычныя заваёвы, непрымірымасць да буржуазнага ладу і яго ідэалогіі, салідарнасць з барацьбітамі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за мір і дэмакратыю, пастаянная падтрымка зарубежных братоў па класу—такія характэрныя рысы савецкага маладога чалавека.

Працавітасць, прага ведаў, гарачае жаданне авалодваць перадавой культурай, расшыраць свой кругагляд, класавая перакананасць і актыўная барацьба супраць падкопаў імперыялізму—яскравае сведчанне таго, што савецкая моладзь свята выконвае запаветы Ільіча, яна імкнецца працаваць і жыць так, як вучыў вялікі Ленін. Сёння, як і заўсёды, маладое пакаленне Краіны Саветаў поўнае рэвалюцыйнага энтузіязму, несакрушальнай упэўненасці ў трыумфе камуністычных ідэалаў.

Сваёй адданасцю ідэям камунізма, справе партыі, ініцыятывай і энергіяй у будаўніцтве сацыялізма і камунізма Ленінскі камсамол заваяваў глыбокую павагу і любоў партыі, усяго савецкага народа.

Грандыёзныя задачы стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, удасканалення грамадскіх адносін, выхавання новага, усебакова развітага чалавека, якія трэба будзе нам вырашаць. І няма нічога больш узвышанага і высакароднага для камсамольцаў, савецкіх юнакоў і дзяўчат, як вернае служэнне народу, самаадданасць у барацьбе за справу камунізма, адказнасць за светлую будучыню сваёй Радзімы.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза выказвае глыбокую ўпэўненасць у тым, што Ленінскі камсамол, савецкая моладзь і ў далейшым будуць актыўнай стваральнай сілай у будаўніцтве камуністычнага грамадства.

Абавязак камсамола—настойліва дабівацца, каб камсамольцы, усе юнакі і дзяўчаты творча авалодвалі марксісцка-ленінскай тэорыяй, выпрацоўвалі класавую самасвядомасць, выхоўвалі ў сабе камуністычныя адносіны да працы і сацыялістычнай уласнасці, умела ўжывалі на практыцы атрыманыя веды. Неабходна штодзённа расшыраць і ўмацоўваць сувязі з масамі моладзі, павышаць баяздольнасць камсамольскіх арганізацый, іх ролю ў палітычным, гаспадарчым і культурным жыцці краіны, у камуністычным выхаванні падрастаючага пакалення. Толькі людзі камуністычнай перакананасці, непрымірымыя да ворагаў рабочага класа, мужныя і стойкія, могуць з гонарам справіцца з задачамі, выстаўленымі гісторыяй перад сацыялістычным грамадствам.

Цэнтральны Камітэт КПСС заклікае камсамольцаў і моладзь да яшчэ больш актыўнага ўдзелу ва ўсенародным патрыятычным спаборніцтве за датэрміновае выкананне заданняў пяцігодкі, за дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Няхай жыве Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі—баявы памочнік і надзейны рэзерв КПСС!

Няхай жыве слаўная савецкая моладзь—апора і будучыня нашай Радзімы!

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі—наперад, да перамогі камунізма!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА.

«Прашу прыняць мяне ў камсамол...»

Чаму перапынілася, дзяўчынка? Аб чым задумалася, перш чым паставіць апошнюю кропку?

Хвалюешся, думаючы пра тое, як паставяцца да тваёй заявы таварышы? Узважваеш сваё кароткае жыццё?

Мусіць, у ім і праўда здарылася яшчэ нямнога падзей.

Біяграфіі чапаеўцаў і будзёнаўцаў, якія пісалі такія заявы ў баявым васемнаццатым, былі багацейшымі.

І хлопцаў, якія станавіліся камсамольцамі на будоўлях Магніткі і Днепрагэса, — таксама.

І дзяўчат, якіх прымалі пад сцягі камсамола падпольныя камсамольскія райкомы часоў Вялікай Айчыннай.

Ды ў чатырнаццаць год галоўнае не мінулае чалавека, а будучае. І якім ён у гэтае будучае ўваходзіць.

Строгімі, дапытлівымі, даверлівымі вачыма глядзяць на цябе сёння шаснаццацігадовыя камісары грамадзянскай вайны.

І юныя селькоры, застрэленыя з кулацкіх абрэзаў.

І будаўнікі Камсамольска.

І героі Краснадонскага і Обальскага падполля.

І першапраходцы цаліны.

І чалавек, які сядзіць побач з табой і разам з табой хвалюецца.

Тое, што для цябе — гераічная легенда, для яго — уласная біяграфія.

Ты ўступаеш у камсамол, і значыць, гэтая біяграфія — працягваецца.

І працягваецца прыгожая, велічная, гераічная біяграфія Ленінскага камсамола.

На здымку—вучаніца 2-й сярэдняй школы г. Мінска Наташа Захарава, прынятая ў камсамол напярэдадні 50-годдзя ВЛКСМ, і яе дзед Іван Цімафеевіч Зуевіч, які стаў камсамольцам у 1921 годзе.

Фота Ул. МЯЖЭВІЧА.

Эдзі АГНЯЦВЕТ

МАІМ СЯБРАМ

Юным заўжды весялей
працуецца,
Юным заўжды весялей
святкуецца.
Вось ад чаго
я хачу заўсёды
Разам ісці з маладым народам.

Сёння ўзышло, зарунела
і выспела
Усё, што ў нялёгкім юнацтве
я выспіла.
Толькі вастрэй адчуваюцца
ў святы
І перамогі,
і горкія страты.

Дзе вы цяпер, мае хлопцы
мілыя?
Многіх сяброў не далічыла я.
Адзін—пад Брэстам,
другі—пад Смаленскам,
А трэці ляжыць у зямлі
славенскай.

І побач:
не гонячыся за славаю —
У цяжкіх шынялях—
бярозкі танклявыя,
Светлыя Машанькі,
Зоі
і Зосі...
На мармуры золата занялося.

Станьце ў строй,
землякі і родзічы!
На баявую паверку выходзячы,
Гляньце на свет,
які вы любілі!
Тут помняць вас,
тут вас не забылі.

І песні ціхія, франтавыя
Аднапалчане пяюць жывыя—
Былыя танкісты,
медсёстры,
сапёры,
Што разам дзялілі і радасць,
і гора.

І дзеці, якія маглі быць
вашымі, —
Вырасці хочуць людзьмі
бясстрашнымі.
І маткі, якія ўсё вас чакаюць,—
Будучым людзям легенды
складаюць.

ПРАМОВА ТАВАРЫША Л. І. БРЭЖНЕВА

НА ЎРАЧЫСТЫМ ПЛЕНУМЕ ЦК ВЛКСМ

Дарагія таварышы камсамольцы!

Паважаныя ветэраны партыі і камсамола!

Паважаныя зарубежныя госці!

Дарагія сябры!

Пяцьдзесят гадоў споўнілася Ленінскаму камсамолу. Гэта вялікае свята савецкага народа. Усе мы, людзі розных пакаленняў, адчуваем сябе сёння маладымі, бо юнацтва наша пачыналася ў камсамольскіх радах. Паўстагоддзя—тэрмін немалы. Але не старэе наш камсамол.

Дазвольце мне ад імя Цэнтральнага Камітэта нашай партыі, камуністаў Савецкага Саюза сардэчна павіншаваць Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі, усю савецкую моладзь з гэтым вялікім і радасным святам.

Народжаны рэвалюцыйнай бурай, загартаваны ў горне класавых бітваў, камсамол — гэта роднае дзецішча бальшавіцкай партыі, баявое юнацтва Краіны Саветаў. Ля яго калыскі стаяў вялікі Ленін. Партыя заўсёды клапатліва расціла, выхоўвала, загартоўвала камсамол, свой надзейны баявы рэзерв.

З 1924 года камсамол носіць імя У. І. Леніна. Прымаючы гэта дарагое імя, камсамольцы пакляліся жыць, працаваць і змагацца па-ленінску, свята выконваць запаветы вялікага настаўніка і правадыра. Сёння мы маем права сказаць, што камсамол верны гэтай непарушнай клятве. Усе слаўныя справы, усе здзяйсненні камсамола, нашай моладзі натхнёны ленінскай думкай.

Наша партыя, увесь савецкі народ высока ацанілі выдатныя баявыя і працоўныя подзвігі камсамола. Пяць орлэнаў на яго сцягу. З пачуццём вялікай радасці хачу паведаміць вам, што выдатныя заслугі савецкай моладзі зноў адзначаны: па прадстаўленню Цэнтральнага Камітэта партыі Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў Ленінскі камсамол у сувязі з яго пяцідзесяцігоддзем ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

Гэта ўзнагарода — усенароднае прызнанне самаадданай патрыятычнай дзейнасці нашай моладзі, якая верная запаветам Леніна, якая ўсю сваю кіпучую энергію, свой розум і талент аддае вялікай справе рэвалюцыі, абароны Айчыны, будаўніцтва камунізма. Усе мы, пачынаўшыя сваю грамадскую дзейнасць у радах камсамола, з хваляваннем успрымаем гэту падзею. Горача і сардэчна віншуем камсамольцаў з гэтай ганаровай і заслужанай узнагародай.

У сувязі з юбілеем камсамола ўзнагароджаны таксама і асобныя яго арганізацыі. Усім ім — нашы гарачыя віншаванні, пажаданні новых працоўных подзвігаў і творчых поспехаў на карысць нашай вялікай Радзімы.

Разам з цяперашнім шматмільённым атрадам камсамольцаў слаўны паўвекавы юбілей адзначаюць усе пакаленні Ленінскага Саюза моладзі.

І ў гэту ўрачыстую гадзіну наша першае слова аб тых, чыя маладосць злілася з барацьбой за перамогу першай у свеце пралетарскай рэвалюцыі, аб тых, хто пачынаў свой шлях у радах Расійскага Саюза Моладзі ў гадзіну жорсткіх баёў супраць ворагаў юнай Рэспублікі Саветаў. Разам з камсамольскім білетам і рэвалюцыйным мандатам юным байцам уручалася вінтоўка. І ішлі на смяротны бой юнакі і дзяўчаты маладой Рэспублікі Саветаў супраць Калчака і Дзянікіна, Юдзеніча і Урангеля, супраць інтэрвентаў 14 дзяржаў.

У барацьбе з ворагамі, пад баявымі сцягамі Камуністычнай партыі мужнелі сыны Ленінскага камсамола. Яны раслі загартаванымі, перакананымі барацьбітамі за шчасце народнае, за сацыялізм.

Словы віншавання з юбілеем у гэты ўрачысты дзень мы звяртаем і да камсамольцаў трыццатых гадоў, да тых, хто быў у першых радах будаўнікоў сацыялізма, хто дапамагаў каваць індустрыяльнае сэрца краіны.

Рэвалюцыйным мандатам юнага пралетарыя, селяніна, рабфакаўца была ў гэтыя гады камсамольская пуцёўка на новабудоўлі. Фронтам сталі рубяжы першых пяцігодак, фронтам працы. Баявым паролем гучалі: Днепрагэс, Турксіб, Магнітка, Камсамольск-на-Амуры. Камсамол шэфстраваў над самымі адказнымі будоўлямі, быў там, дзе больш цяжка.

Мы не забылі і ніколі не забудзем, як у люты мароз кіркамі і лапатамі капалі юнакі і дзяўчаты катлаваны, як нагамі ўтрамбоўвалі бетон.

Успомніце, сябры, як у вёсцы першыя камсамольцы пераворвалі не толькі старыя межы, але, як тады гаварылі, і старыя прывычкі, увесь векавы ўклад вясковага жыцця. Бывала так, што па ўсё сяло два-тры камсамольцы, але яны смела кідалі выклік класаваму ворагу. Не баючыся кулацкіх куль, узнімалі камсамольцы сельскую моладзь на барацьбу за калектывізацыю.

Час быў гарачы, як гаворыцца, дух займала. Камсамол вучыўся сам і па меры сіл сваіх і ведаў вучыў іншых. Камсамольцы стваралі гурткі лікбеза, адкрывалі шлях да багацтваў ведаў мільёнам непісьменных, неслі святло новага жыцця. Вялікі ўклад камсамольцаў у тую сапраўдную культурную рэвалюцыю, якая была ажыццёўлена ў нашай краіне.

Моладзь трыццатых гадоў увайшла ў летапіс камсамола штурмуючай стратасферу, змагаючайся ў радах інтэрнацыянальных брыгад, узрываючай таежную глуш. Разам са старэйшымі таварышамі стваралі камсамольцы ў гэтыя гады фундамент сацыялізма. Гэты фундамент сцэментаван небывалым працоўным гераізмам і рэвалюцыйным энтузіязмам.

З 50-годдзем ВЛКСМ мы віншуем сёння і камсамольцаў—герояў Вялікай Айчыннай вайны, тых, хто па першаму закліку маці-Айчыны, па закліку партыі мужна стаў на абарону сацыялізма.

Як і іх бацькі і маці ў гады грамадзянскай вайны, юнакі і дзяўчаты цэлымі камсамольскімі арганізацыямі ўходзілі на фронт. Назаўсёды застануцца ў нашых сэрцах, у памяці будучых пакаленняў подзвігі маладых герояў на франтах, у тыле ворага, ля станкоў і на калгасных палях.

Вырасшае ўжо пры Савецкай уладзе маладое пакаленне даказала, што яно бераклівa нясе праз гады і дзесяцігоддзі агонь рэвалюцыйных традыцый.

Як і ў часы Мікалая Астроўскага, камсамольская сталь загартоўвалася ў агні бітваў, у напружанай, самаадданай працы. Юнакі і дзяўчаты учарашнія школьнікі, якія не ведалі да таго часу ні голаду, ні нястачы, у суровы час выпрабаванняў праявілі вытрымку, стойкасць і непахісную веру ў перамогу.

Зоя Касмадзям'янская, Алег Кашавой, Ліза Чайкіна, Аляксандр Матросаў, Мікалай Гастэла, Марытэ Мельнікайтэ... Дастаткова сказаць гэтыя імёны, і перад намі ўзнікае яркая хвалюючая карціна масавага гераізму, самаадданасці, душэўнай чысціні і высакароднасці, якіх не ведала гісторыя ранейшых эпох.

Такімі былі камсамольцы саракавых гадоў, выхаваныя партыяй у духу беззапаветнай адданасці ідэям ленінізма, сацыялістычнай Айчыне.

Так, таварышы! Ніколі і нікому не перамагчы краіну, дзе кожнае новае пакаленне захоўвае і прымнажае баявыя традыцыі папярэдніх пакаленняў.

Яшчэ не адгрымелі гарматы, як па закліку партыі камсамол узяўся за аднаўленне народнай гаспадаркі, разбуранай вайной. Маладыя, моцныя духам хлопцы прыйшлі на «Запарожсталь», у Данбас, Сталінград вяртаць да жыцця ўсе тое, што было створана старэйшымі братамі і бацькамі і па-варварску знішчана ворагам.

У небывала кароткія тэрміны мы залячылі глыбокія раны вайны. Там, дзе была выпаленая ворагам зямля, зазеляненелі нівы, выраслі карпусы заводаў, узняліся з руін гарады і вёскі. Гэта быў вялікі працоўны подзвіг.

Камсамол нашых дзён — гэта дваццаць тры мільёны маладых барацьбітоў за камунізм, юнакоў і дзяўчат больш ста нацый і народнасцей. Гэта пакаленне, якое вырасла пасля Айчыннай вайны.

Хоць гэта пакаленне і самае маладое, але яно здзейсніла ўжо нямала слаўных спраў. Сведчаннем гэтаму — ударныя камсамольскія будоўлі, працоўныя дасягненні маладых рабочых і калгаснікаў.

Мы не можам уявіць сабе біяграфіі камсамола без эпапеі Брацка, Руднага, Нарыльска, Сумгаіта, Руставі і многіх іншых будоўляў. 350 тысяч маладых людзей па камсамольскіх пуцёўках паехалі ўзорваць цаліну. Тысячы добраахвотнікаў дапамагаюць будаваць гіганцкую Краснаярскую ГЭС і самаадданa працуюць на рашаючых будоўлях пяцігодкі. У цяперашніх камсамольцаў, як і ў іх старэйшых братоў, ёсць свае памятныя вяхі, ёсць свае імёны, на якія раўняецца юнацтва краіны. Мы з поўнай падставай можам сказаць што камсамольская змена дастойна працягвае справы папярэдніх пакаленняў маладых будаўнікоў камунізма.

Таварышы! Сёння, напярэдадні 50-годдзя Ленінскага Саюза Моладзі, мы ў думках звяртаемся да светлай памяці тых юнакоў і дзяўчат, беззапаветных герояў, байцоў шматмільённай арміі камсамола, хто аддаў сваё жыццё за нашу агульную справу.

Дзяўчына ў скуранай тужурцы, забітая белагвардзейскай куляй, юнак у салдацкай гімнасцёрцы, які прыкрыў сэрцам амбразуру фашысцкага дота, — яны сёння з намі. Мы ўспамінаем і гаворым пра іх не як аб загінуўшых, а як аб жывых. Яны былі маладымі, калі смерць вырвала іх з баявых радоў. Але вечна маладыя, яны сёння з намі Прапаную ўшанаваць мінутай маўчання памяць

[Заканчэнне на 2-й стар.].

ШЛЯХАМ БАРАЦЬБЫ І ПЕРАМОГ

КРАІНА ЎРАЧЫСТА АДЗНАЧАЕ 50-годдзе ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА

У гэтыя восеньскія дні нібы памаладзела ўся наша краіна. Ад Брэста да Уладзівастока, ад свінцовых вод Белага мора да Кушкі, дзе і зараз няшчадна паліць сонца, звіняць камсамольскія песні. Вялікае свята прыйшло на нашу зямлю — 50-годдзе Ленінскага камсамола.

Гэта свята ўсіх пакаленняў слаўнай камсамоліі — і тых, каму сёння дваццаць, і каму — семдзесят. Мы ніколі не забудзем подзвігі нашых бацькоў і дзядоў на кастрычніцкіх барыкадах, на франтах грамадзянскай вайны. Мы захапляемся гераічнай працай першапраходцаў сацыялізма — тых, хто ўзводзіў заводы і фабрыкі першых пяцігодак. У вяках будзе жыць памяць аб тых, хто ў смяротным баі супраць фашысцкай навалы адстаяў свабоду і незалежнасць нашай сцяглай Радзімы. А як не ганарыцца самаадданай працай пасляваеннай камсамоліі! Гэта яе працавітыя рукі паднімалі цалінныя землі, будавалі новыя гарады і вёскі, пракладалі дарогу ў космас.

Усё гэта этапы слаўнай гісторыі камсамола— яркае сведчанне пераемнасці пакаленняў. І таму ёсць высокі сэнс у тым, што ў Крамлёўскі Палац з'ездаў на ўрачысты Пленум Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ, што адбыўся 25 кастрычніка, прыйшлі не толькі тыя, хто зараз носіць ля сэрца камсамольскі білет, а і пасівелыя ветэраны, для якіх камсамол — даўнія старонкі біяграфіі.

«...Усе мы, людзі розных пакаленняў, адчуваем сябе сёння маладымі, бо юнацтва наша пачыналася ў камсамольскіх радах, — сказаў, звяртаючыся да ўдзельнікаў урачыстага Пленума, Генеральны сакратар ЦК КПСС Леанід Ільіч Брэжнеў. — Паўстагоддзя — тэрмін не малы. Але не старэе наш камсамол...»

Так, не старэе камсамол. Пра яго вечную маладосць, пра адданасць справе ленінскай партыі гаворыцца ў Прывітанні Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза Усесаюзнаму Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу Моладзі.

І ў дакладзе першага сакратара ЦК ВЛКСМ Я. М. Цяжэльнікава, які расказаў аб слаўным шляху, пройдзеным камсамолам пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі за 50 год, і ў выступленнях удзельнікаў пленума — прадстаўнікоў розных пакаленняў панавала думка аб тым, што ў савецкай моладзі няма больш цудоўнай мэты, чым, раўняючыся на старэйшых, аддаваць свае сілы і веды вялікай справе будаўніцтва камунізма. Яны гаварылі, што ўсё, чым жыве, аб чым марыць сёння савецкая моладзь, уся радасць сённяшняга камсамольскага свята непарыўна звязаны з партыяй, з Леніным, з вялікім Кастрычнікам. І ўсім, што сёння мае маладое пакаленне, яно абавязана партыі, яе мудраму кіраўніцтву, яе матчынай любві.

У гэты дзень у Галоўнай зале краіны было выказана шмат самых добрых слоў у адрас камсамоліі. І як апафеоз прызнання гістарычных заслуг Ленінскага камсамола прагучала паведамленне аб тым, што ВЛКСМ у сувязі з пяцідзесяцігоддзем узнагароджваецца шостым ордэнам — ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

— Гэта — узнагарода ўсім камсамольцам усіх пакаленняў: сівым ветэранам і камсамольцам сённяшняга дня, — падкрэсліў у выступленні пры ўручэнні ордэна Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. В. Падгорны.

У сувязі з 50-годдзем ВЛКСМ ордэнамі Савецкага Саюза ўзнагароджаны рад гарадскіх, раённых і пярвічных камсамольскіх арганізацый. Сярод іх — Любанская раённая камсамольская арганізацыя і Наваполацкая гарадская камсамольская арганізацыя.

— Ад імя камсамольцаў і моладзі мы горача дзякуем партыі, народу, Савецкай Радзіме за гэтыя дарагія для нас узнагароды і запэўняем, што ўпішам новыя слаўныя старонкі ў летапіс Ленінскага камсамола, заўсёды будзем на пярэднім краі барацьбы за камунізм. Мы лічым сваім вышэйшым абавязкам — нястомна працягваць рэвалюцыйную справу бацькоў. Асновай жыцця савецкай моладзі заўсёды будуць гераічныя традыцыі нашага народа, — заявілі ў сваім пісьме Цэнтральнаму Камітэту КПСС удзельнікі ўрачыстага Пленума ЦК ВЛКСМ.

Вялікае свята камсамола працягваецца. У гэтыя дні яшчэ і яшчэ раз моладзь Краіны Саветаў паўтарае клятву верчасці вялікай мэце, у імя якой змагаўся Уладзімір Ільіч Ленін, — будаўніцтву камунізма.

ПРАМОВА ТАВАРЫША Л. І. БРЭЖНЕВА

НА ЎРАЧЫСТЫМ ПЛЕНУМЕ ЦК ВЛКСМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

юных барацьбітоў і будаўнікоў новага грамадства, якія аддалі за перамогу бессмяротных ленінскіх ідэалаў самае каштоўнае, што ў іх было, — сваё жыццё.

Таварышы! Задачы камсамола ў будаўніцтве сацыялізма і камуністычным выхаванні маладога пакалення вызначаны былі Леніным на трэцім з'ездзе камсамола ў 1920 годзе. Уладзімір Ільіч Ленін раскрыў змест, метады работы Саюза моладзі, канкрэтна паказаў, што павінен рабіць камсамол у якасці памочніка Камуністычнай партыі, вызначыў ролю і месца моладзі ў грамадскім жыцці, у будаўніцтве камуністычнага грамадства.

Трэба было валодаць ленінскім дарам геніяльнага прадбачання, каб у дні выпрабаванняў, калі маладую Краіну Саветаў сціскалі ціскі інтэрвенцыі, голаду, мяцяжоў і разрухі, думкай пранікнуць у будучыню і ўказаць моладзі дарогу ў камуністычнае заўтра.

Амаль паўстагоддзя прайшло з таго дня, як Ленін сказаў сваю прамову. Але кожнае новае пакаленне нязменна звяртаецца да яе ў пошуках адказу на тыя пытанні, якія выстаўляюцца новымі ўмовамі абстаноўкі, якая мяняецца.

Гістарычная прамова У. І. Леніна была і застаецца важнейшым тэарэтычным дакументам нашай партыі, які вызначае яе задачы па выхаванню моладзі. Кіруючыся запаветамі Леніна, наша партыя, яе Цэнтральны Камітэт на ўсіх этапах рэвалюцыйнай барацьбы і камуністычнага будаўніцтва пабацькоўску клапаціліся аб моладзі.

Усе парады нашай партыі камсамолу, усе заклікі яе, звернутыя да маладой змены, прасякнуты ленінскімі клопатамі аб тым, каб моладзь была актыўным удзельнікам камуністычнага будаўніцтва, ва ўсіх агульнанародных справах магла праявіць сваю ініцыятыву і пачын.

Партыя заўсёды была для камсамола старэйшым другам, добрым дарадчыкам і настаўнікам, заўсёды прымала блізка да сэрца думы, патрэбы, імкненні маладога пакалення.

Моладзі ўласціва імкнуцца да будучыні, бо будучыня закладзена і ў ёй самой. Яна ідзе за партыяй камуністаў таму, што партыя вядзе працоўных у будучыню, да вялікай мэты, якая заўсёды прыцягвала і натхняла перадавую моладзь,—да камунізма!

Мы жывём у выдатны час, калі шырокім фронтам у краіне разгарнулася будаўніцтва камуністычнага грамадства, стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма. Гэта стала магчымым таму, што, пабудаваўшы сацыялізм, савецкі народ пад кіраўніцтвам партыі стварыў новыя грамадскія адносіны, магутныя прадукцыйныя сілы, перадавую навуку і культуру.

Паглядзіце, на якія рубяжы выйшла сёння наша Радзіма: выплаўка сталі дасягае 107 мільёнаў тон, здабыча нафты перавысіць у гэтым годзе 300 мільёнаў тон, здабыча вугалю складзе амаль 600 мільёнаў тон, выпрацоўка электраэнергіі — 640 мільярдаў кілават-гадзін!

Але партыя заўсёды глядзіць наперад. Новыя па маштабах і па зместу задачы пастаўлены перад намі XXIII з'ездам КПСС. Праграмай нашай партыі. Нам трэба будзе ўмацоўваць і развіваць нашу грамадскую і дзяржаўную арганізацыю, удасканальваць сацыялістычную дэмакратыю, дабівацца ўсё больш поўнага раскрыцця пераваг і творчых магчымасцей, закладзеных у сацыялістычным ладзе, далейшага паляпшэння жыццёвых умоў народа.

Нам трэба будзе будаваць і будаваць — заводы і фабрыкі, шахты і электрастанцыі, новыя гарады і пасёлкі, арашальныя сістэмы і лініі электраперадач, мільёны новых кватэр, тысячы школ, дзіцячых садоў. Мы ведаем, як казачна багатыя нетры нашай Радзімы. Але, бадай, толькі цяпер, калі экскаватар і бульдозер, а не кірка і рыдлёўка, сталі сімвалам новабудоўлі, калі алмазныя наканечнікі бураў на 5—6 кіламетраў угрызаюцца ў зямлю, мы можам па-сапраўднаму выкарыстоўваць нашы прыродныя рэсурсы.

Аб размаху нашых спраў, аб смеласці нашых планаў, аб грандыёзнасці таго, што мы робім і што трэба будзе здзейсніць, можна меркаваць хоць бы па такіх прыкладах. З Татарыі на захад да Брэста і на ўсход да Іркуцка амаль на дзевяць тысяч кіламетраў пралягла новая нафтавая артэрыя краіны. А цяпер на чарзе будаўніцтва газаправода з Сібіры, дзе багацейшыя запасы газу былі да гэтага часу недаступныя чалавеку, у еўрапейскую частку краіны. Праз тайгу, рэкі і горы газ прыйдзе ў гарады і пасёлкі, на прадпрыемствы і ў жылыя дамы. Або вазьміце Саяна-Шушанскую ГЭС, узвядзенне якой пачалося ў гэтым годзе. Яна будзе роўная дзесяці Днепрагэсам. Вось якія маштабы ў нашы дні!

Ва ўсіх гэтых вялікіх справах на самай перадавой лініі камуністычнага будаўніцтва сёння, як і раней, наша слаўная рабочая моладзь — душа і сэрца камсамола. Яна з гонарам працягвае рэвалюцыйныя традыцыі старэйшых пакаленняў гераічнага рабочага класа СССР, умела асвойвае высокае майстэрства ветэранаў—майстроў вытворчасці. Залатыя рукі маладых рабочых і работніц памнажаюць багацце Радзімы, ствараюць аснову для паляпшэння жыцця народа, ажыццяўляюць смелыя ідэі нашых вучоных і канструктараў.

Звяртаючыся да камсамольцаў заводаў і фабрык, партыя гаворыць: будзьце застрэльшчыкамі новага, перадавога, уносьце свежую думку, знаходлівасць, вынаходствы ў працэсы тэхналогіі і вытворчасці, будзьце нецярпімымі да руціны.

Мы будуем цяпер больш кватэр, чым любая іншая краіна ў свеце. У бягучай пяцігодцы палепшаць свае жыллёвыя ўмовы і пераедуць у новыя дамы больш 60 мільёнаў чалавек. Па сутнасці справы ідзе працэс абнаўлення жыллёвага фонду ўсёй нашай краіны.

Удумайцеся, дарагія таварышы, у сацыяльны сэнс гэтага працэсу. Канчаюць свой век атрыманыя ў спадчыну яшчэ ад царскіх часоў старыя домікі і баракі ранейшых гадоў. Мільёны сем'яў усяляюцца ў светлыя сучасныя дамы, атрымліваюць асобныя кватэры з электрычнасцю, газам, з гарачай вадой. Гэта значыць, што карэнным чынам мяняецца быт людзей, паляпшаюцца ўмовы для адпачынку, культурнага вольнага часу, для вучобы, выхавання дзяцей.

Вядома, таварышы, з жыллём і бытам у нас яшчэ ёсць цяжкасці. Не ўсе яшчэ жывуць так, як хацелася б. Ёсць яшчэ і рабочыя інтэрнаты. З гэтым прыйдзецца якісьці час мірыцца. Гэтыя цяжкасці, як вы ведаеце, змяншаюцца з кожным годам па меры таго, як шырыцца размах будаўніцтва. Многае тут залежыць ад нашых будаўнікоў.

Як бачыце, і ў далейшым званне будаўнік будзе ў вялікай пашане. І партыя верыць, што ў рады будаўнікоў увальюцца новыя атрады моладзі. Хочацца пажадаць, каб камсамольскія будоўлі раслі самымі шпаркімі тэмпамі і былі на вышыні сучасных патрабаванняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, каб камсамольцы-будаўнікі скрозь і ўсюды служылі прыкладам. Будаваць хутка, будаваць добра, з найбольшым эфектам выкарыстоўваць тэхніку і матэрыяльныя рэсурсы — вось што патрабуецца цяпер, вось за што павінен змагацца камсамол на будоўлі!

Няхай і ў далейшым прыцягвае нашу моладзь высокі гонар быць першымі будаўнікамі, мантажнікамі, першымі жыхарамі гарадоў, яшчэ не нанесеных на карту. Нашы планы, нашы задумы не могуць не запальваць маладыя сэрцы, якім такая блізкая рамантыка суровай працы, радасць першаадкрывальнікаў.

Але ўжо калі гаварыць аб рамантыцы, таварышы, то як не сказаць аб тых гарызонтах, якія адкрываюць перад дапытлівым маладым розумам бурны рост сучаснай навукі і тэхнікі, дасягненні фізікі, хіміі, адкрыцці ў біялогіі.

Гіганцкія, небывалыя нават у наш атамны век рэсурсы энергіі атрымаюць людзі, навучыўшыся кіраваць працэсам сінтэзу атамнага ядра. Далейшыя поспехі ў даследаванні космасу дазволяць не толькі непасрэдна пазнаёміцца з Месяцам і суседнімі планетамі, але і падабраць ключы да вырашэння іншых загадак Сусвету, растлумачэнне якіх акажа велізарны ўплыў на ўвесь прагрэс навукі і тэхнікі. Пазнанне законаў генетыкі дазволіць кіраваць спадчыннасцю, уплываць на фарміраванне жывых арганізмаў, вырашаць многія праблемы барацьбы з хваробамі, значна расшырыць харчовыя рэсурсы чалавецтва.

Вы можаце ганарыцца тым, што ў нашай навуцы нямала камсамольцаў або работнікаў, якія прайшлі школу камсамола. Маладыя навуковыя работнікі разам з вядомымі вучонымі актыўна ўдзельнічаюць у вырашэнні важнейшых праблем навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, уносяць у навуковую творчасць дух наватарства, смелага пошуку.

Мы павінны зыходзіць з таго, што паспяховае выкананне нашых эканамічных планаў немагчыма без выкарыстання навейшых навукова-тэхнічных адкрыццяў у нашай народнай гаспадарцы.

Вось чаму партыя заклікае камсамол: яшчэ шырэй разгортваць рух моладзі за авалоданне сучаснай навукай і тэхнікай, больш актыўна займацца пытаннямі навуковай арганізацыі працы, кіравання вытворчасцю!

А якая прастора ініцыятыве, слаўным прапоўным пачынам адкрываецца перад моладдзю сяла!

Звяртаючыся да юнацтва ў 1935 годзе, А. М. Горкі гаварыў:

«Мы павінны ўсю зямлю нашу апрацаваць, як сад, асушыць балоты, забяспечыць вадой бязводныя пустыні, каналізаваць і паглыбіць рэкі, пабудаваць мільёны кіламетраў дарог, вычысціць велізарныя нашы лясы. У нашай краіне не павінна быць месца саранчы, якая знішчае збожжа, камарам, якія прывіваюць людзям ліхаманкі... Гэта, зразумела, яшчэ не ўсё,—ёсць яшчэ шмат разнастайнай, вясёлай работы па будаўніцтву першай сапраўды культурнай, сацыялістычнай дзяржавы, гэта работа чакае вас, і яна патрабуе шырокіх навуковых ведаў».

Зразумела, з таго часу, як былі сказаны гэтыя словы, было зроблена многае. Праведзены велізарныя работы па арашэнню пустынь, будаўніцтву каналаў, дарог, асушэнню балот.

Савецкія вучоныя, аграномы, лётчыкі грамадзянскай авіяцыі знішчылі страшэнны біч — саранчу. Адолелі і такога шкодніка, як малярыйны камар. Але якая захапляючая работа яшчэ ўперадзе!

Так, таварышы, у сельскай гаспадарцы, як і ў прамысловасці, мы выйшлі на новыя рубяжы. Мы ў стане цяпер выдзяляць сельскай гаспадарцы больш капіталаўкладанняў, больш машын, угнаенняў, электраэнергіі. Мы хочам узняць сельскую гаспадарку па прадукцыйнасці і эфектыўнасці працы, па тэхнічнай аснашчанасці да ўзроўню нашай прамысловасці.

Партыя паставіла сапраўды вялікую мэту — збавіць сельскую гаспадарку ад капрызаў прыроды, вывесці яе з пастаяннай залежнасці ад кліматычных умоў. У нашай краіне ажыццяўляецца доўгатэрміновы план меліярацыі.

Буйныя арашальныя сістэмы будуюцца ля легендарнай Кахоўкі і на Паўночным Каўказе, ва Узбекістане і ў Заволжы; ідзе будаўніцтва трэцяй чаргі Кара-Кумскага канала.

Усе мы высока цэнім ініцыятыву камсамола, які заклікаў моладзь прысвяціць сябе рабоце ў вёсцы пасля заканчэння школы, авалодваць прафесіямі агранома, меліяратара, заатэхніка, інжынера, механізатара, працаваць на фермах і на палях, ехаць працаваць у сельскія школы, бальніцы, клубы.

Па-гаспадарску выкарыстоўваць кожны гектар зямлі, вырошчваць два каласы там, дзе рос адзін, дабівацца агульнага ўздыму культуры земляробства і жывёлагадоўлі — вось баявая задача сельскай моладзі. Вялікая роля камсамола і ў паляпшэнні быту вёскі, у аказанні дапамогі школе, у клубнай рабоце, у спартыўных і іншых блізкіх маладым людзям цікавых, карысных справах.

Любая работа ў нас мае грамадскае значэнне. Любая праца ўліваецца ў агульны паток намаганняў народа, які стварае камуністычнае грамадства. Хацелася б добрым словам адзначыць камсамольцаў, якія прысвяцілі сябе рабоце ў сферы абслугоўвання і быту. На першы погляд, іх работа здаецца простай, будзённай. Але, бадай, ніякая іншая праца не мае такога ўплыву на штодзённае жыццё людзей, а калі хочаце, то і на іх самаадчуванне, настрой і нават на працаздольнасць. Партыя ўдзяляе шмат увагі развіццю гандлю, грамадскага харчавання, культурна-бытавому абслугоўванню ў горадзе і ў вёсцы. І камсамол павінен актыўна дапамагаць у гэтай вялікай справе.

У адным з выступленняў перад моладдзю Міхаіл Іванавіч Калінін гаварыў, што ў любой рабоце, у любой галіне чалавечай дзейнасці могуць сустракацца людзі, якіх называюць рамеснікамі, і людзі, якіх завуць майстрамі, мастакамі сваёй справы. Усё залежыць ад таго, як чалавек адносіцца да гэтай справы, ці ўкладвае ён у работу сваю душу або разглядае яе як цяжкую павіннасць і працуе па прынцыпу «адгэтуль і дагэтуль».

Нашы з вамі агульныя клопаты заключаюцца ў тым, каб юнакі і дзяўчаты Савецкай краіны раслі не абыякавымі рамеснікамі, а мастакамі, майстрамі сваёй справы, людзьмі, захопленымі справай, людзьмі, для якіх праца стала патрэбнасцю і асалодай.

Савецкі лад забяспечвае шырокія магчымасці для ўдзелу моладзі ў грамадскай і дзяржаўнай дзейнасці. Немагчыма ўявіць сабе работу нашых Саветаў, прафсаюзаў, дзяржаўных устаноў без актыўнага ўдзелу камсамольцаў. Каля трохсотпяцідзесяці тысяч маладых людзей выбраны дэпутатамі мясцовых Саветаў. Вярхоўных Саветаў рэспублік. У вышэйшым органе заканадаўчай улады краіны — Вярхоўным Савеце СССР — 182 прадстаўнікі маладога пакалення.

Вельмі вялікую работу праводзяць студэнцкія камсамольскія арганізацыі. Камсамол дапамагае фарміраванню ў студэнтаў марксісцка-ленінскага светапогляду, выступае застрэльшчыкам удзелу студэнтаў у агульнанароднай працы і грамадскай дзейнасці.

Не меншая работа ляжыць на плячах камсамола ў школе, асабліва па кіраўніцтву піянерскай арганізацыяй. Мы добра ведаем, якая гэта нялёгкая справа. Яна патрабуе сардэчнасці, працавітасці і, як усякая работа з дзецьмі, цярпення і настойлівасці, умення заахвоціць дзяцей на добрыя справы. На ўсё жыццё дзеці запамінаюць сваіх важатых. Камсамол дастойна выконвае гэтае важнае і ганаровае даручэнне партыі.

Таварышы! Усе вы добра ведаеце, якія выдатныя магчымасці створаны ў нашай краіне для культурнага росту і творчасці. Столькі тэатраў і палацаў культуры, кінатэатраў, клубаў, бібліятэк, музеяў, як у нас, няма нідзе. І ўсё, што створана ў гэтай галіне савецкім народам,—даступна моладзі. Я ўжо не кажу аб тым, што мы маем таксама маладзёжныя тэатры і тэатры для дзяцей, палацы і дамы піянераў, мастацкія студыі для юнацтва, выдавецтвы для моладзі і дзяцей і г. д. Гэтыя клопаты партыі, Савецкай дзяржавы аб культурным развіцці маладога пакалення даюць свой плён. Паглядзіце, як разгарнулася, напрыклад, у нас мастацкая самадзейнасць, як расце ўзровень майстэрства яе ўдзельнікаў! А нашы народныя тэатры, творчыя аб'яднанні ў заводскіх і сельскіх клубах, мастацкія студыі, клубы вясёлых і знаходлівых! Іх творчасць не толькі дастаўляе эстэтычную асалоду мільёнам людзей у краіне, але таксама выяўляе, выхоўвае і ўзнімае маладыя таленты, здольныя абагаціць наша мастацтва. Вядома, бывае часам, што там-сям нашым маладым аўтарам і выканаўцам здраджвае густ. Але на тое і існуюць творчыя саюзы, на тое і камсамол, каб своечасова ўбачыць гэта, паклапаціцца аб тым, каб эстэтычнае выхаванне моладзі вялося на высокім ідэйным і мастацкім узроўні, каб яно развівала здаровыя густы, было радасным і жыццесцвярджальным, каб яно адухатварала працу і жыццё моладзі.

Мы хочам бачыць нашу моладзь не толькі ўсебакова адукаванай і духоўна прыгожай, але і здаровай, загартаванай, фізічна дужай. У гэтыя дні ўсе мы сочым за Алімпіядай у Мексіцы, балеем за нашу каманду. Не ўсё ўдалося там, як гэта хацелася нашым спартсменам. Барацьба была сапраўды цяжкай, і мы вітаем пераможцаў, якія вяртаюцца на Радзіму з алімпійскімі медалямі. Трэба і ў далейшым падымаць міжнародны клас нашага спорту. Але галоўнае — гэта масавасць спартыўнага руху, развіццё фізічнай культуры, якая ахоплівае ўсю моладзь, загартоўка яе валявых якасцей, фізічная падрыхтоўка юнакоў і дзяўчат да працы і абароны.

Таварышы! Будаўніцтва камунізма ў нашай краіне, умацаванне магутнасці і абараназдольнасці нашай Радзімы — надзейнай апоры сацыялізма, міру і свабоды ўсіх народаў Камуністычная партыя і ўвесь народ Савецкага Саюза разглядаюць як важнейшую частку свайго **інтэрнацыянальнага абавязку.**

Мы ніколі не аддзялялі сваіх задач і спраў ад агульнай справы вызвалення працоўных усіх краін—справы сацыялізма і міру ва ўсім свеце. Інтэрнацыяналізм, можна сказаць, у крыві ва ўсіх нас. Ён вынашан некалькімі пакаленнямі савецкіх людзей, і кожная эпоха падвяргала яго новай праверцы, ставіла перад ім новыя задачы.

Велізарная шматбаковая дапамога, якую ў нашы дні аказвае савецкі народ патрыётам В'етнама ў іх гераічнай барацьбе супраць імперыялістычнай агрэсіі. Актыўная падтрымка справядлівай вызваленчай барацьбы арабскіх краін, разнастайныя формы садзейнічання народам маладых дзяржаў, якія скінулі каланіяльнае ярмо і сталі на шлях антыімперыялістычнай барацьбы, на шлях прагрэсіўнага развіцця, шырокія ўсебаковыя міжнародныя сувязі савецкага народа, у тым ліку і камсамола, — усё гэта праяўленне інтэрнацыяналізму савецкіх людзей у сучасных умовах. І, вядома, важнейшае месца ў гэтых адносінах займаюць пачуцці гарачай дружбы і салідарнасці савецкіх людзей з народамі брацкіх краін сацыялізма, пастаяннае развіццё і паглыбленне ўсіх форм кантактаў, сувязей і плённага супрацоўніцтва з імі, глыбокае пачуццё сумеснай адказнасці за нашу агульную вялікую справу — справу сацыялізма і камунізма.

Камсамол праводзіць вялікую работу па выхаванню моладзі нашай краіны ў духу інтэрнацыяналістскіх традыцый партыі Леніна. Мільёнамі канкрэтных спраў пацвярджаюць нашы камсамольцы сваю салідарнасць з братамі па класу, з працоўнымі ўсіх краін. Гонар і слава савецкай моладзі, якая высока нясе сцяг класавай салідарнасці, сцяг пралетарскага, сацыялістычнага інтэрнацыяналізму!

Таварышы! Жыццё зноў і зноў пацвярджае глыбокую справядлівасць вядомых ленінскіх слоў аб тым, што ўсякая рэвалюцыя толькі тады чаго-небудзь варта, калі яна ўмее абараняцца. Абарону нашых сацыялістычных заваёў, забеспячэнне мірнай працы савецкіх людзей наша партыя заўсёды лічыла сваім свяшчэнным абавязкам як перад савецкім народам, так і перад працоўнымі ўсіх краін. І ў гэтым камсамол быў і застаецца верным, актыўным памочнікам партыі.

Ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі заўсёды было адной з самых яркіх старонак дзейнасці камсамола. З першых гадоў свайго існавання камсамол шэфствуе над Ваенна-Марскім Флотам, а з 1931 года — і над Ваенна-Паветраным Флотам. І можна з упэўненасцю сказаць, што сярод тысяч і тысяч герояў, якія праславілі нашу Радзіму ў баях з фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, нямала знойдзецца тых, хто звёў сваё першае знаёмства з канструкцыяй кулямёта, з планерам або парашутам, са штурвалам самалёта або маторнага катэра ў гуртках, клубах і школах, арганізаваных пры садзейнічанні камсамола.

І ў нашы дні ваенна-патрыятычнае выхаванне застаецца адной з важных задач фарміравання маладога пакалення. Як і многія іншыя справы, атрыманыя ў спадчыну ад мінулых дзесяцігоддзяў, гэта задача мае сёння сваю спецыфіку. Ваенная тэхніка ў нашы дні — гэта не абцягнутыя парусінай «фарманы» 20-х гадоў і нават не «ястрабкі» і «утачкі» перыяду Айчыннай вайны. Сёння абаронцы Савецкай Радзімы павінны валодаць майстэрствам кіравання міжкантынентальнымі ракетамі, ваджэння звышгукавых самалётаў, атамных падводных лодак, быць знаўцамі многіх іншых складанейшых відаў зброі.

Сёння патрэбны ўжо не толькі проста смелыя, трэніраваныя, мускулістыя хлопцы з трапным вокам і цвёрдай рукой, але і інжынеры, матэматыкі, знаёмыя з тайнамі электронікі і кібернетыкі. Задачы, такім чынам, і ў гэтай галіне сталі больш складанымі, адказнымі, узняліся на новы ўзровень. Але камсамольская хватка, энтузіязм, дзярзанне маладосці, мужнасць і адвага патрэбны сёння гэтак жа, як і ў часы грамадзянскай вайны і першых пяцігодак, як у вогненныя гады Вялікай Айчыннай. І ў гэтай галіне, таварышы, перад камсамолам — поле дзейнасці велізарнага агульнадзяржаўнага, агульнанароднага значэння.

Адна з галоўных крыніц сілы камсамола, сілы яго ўздзеяння на моладзь заключаецца ў тым, што камсамол дапамагае партыі несці ў шырокія масы маладых грамадзян нашай краіны вялікую праўду марксісцка-ленінскіх ідэй. Камсамол дапамагае партыі ўзброіваць нашых юнакоў і дзяўчат навуковым разуменнем гісторыі, вопытам барацьбы папярэдніх пакаленняў, разуменнем сэнсу і задач сённяшняй нашай працы і нашай барацьбы з класавымі ворагамі; ён дапамагае маладым людзям убачыць дакладныя і ясныя перспектывы нашага далейшага руху наперад, да камунізма.

Хочацца зноў і зноў падкрэсліць, што калі партыя гаворыць аб палітычнай вучобе моладзі, аб авалоданні марксісцка-ленінскай тэорыяй, то маецца на ўвазе не механічнае зазубрыванне тых або іншых палажэнняў, тых або іншых кніжак, а авалоданне самой сутнасцю марксісцка-ленінскага светапогляду. Гэта значыць, што нашы маладыя грамадзяне павінны не проста добра ведаць асноўныя палажэнні марксісцка-ленінскай тэорыі, а павінны вучыцца знаходзіць у гэтай тэорыі, у работах класікаў марксізма-ленінізма, у дакументах партыі аснову, ключ, самы правільны метад для вырашэння тых пытанняў, якія ставіць на парадак дня наша сённяшняе жыццё. Гутарка, значыць, ідзе аб выпрацоўцы сапраўднай глыбокай марксісцкай перакананасці, выразнага класавага падыходу да ўсіх з'яў грамадскага жыцця, аб тым, каб навучыцца творча прымяняць вялікае багацце тэорыі марксізма-ленінізма.

Мы жывём у эпоху вострай класавай барацьбы на сусветнай арэне. Імперыялістычныя дзяржавы разгарнулі жорсткую ідэалагічную вайну супраць краін сацыялізма, імкнучыся актывізаваць падрыўную работу ўнутры сацыялістычнага лагера, убіць клінні паміж асобнымі сацыялістычнымі краінамі, аслабіць адзінства міжнароднага камуністычнага руху.

У ходзе гэтай барацьбы нашы класавыя праціўнікі прыкладаюць нямала намаганняў, спрабуючы зрабіць уплыў і на розумы моладзі ў сацыялістычных краінах. Яны прыкрываюцца маскай «сяброў моладзі», імкнуцца зацягнуць у свае сеткі палітычна няўстойлівых, нявопытных маладых людзей, прытупіць іх класавую, рэвалюцыйную пільнасць ілжывымі разважаннямі буржуазна-ліберальнага толку, стараюцца распальваць нацыяналістычныя настроі, шукаюць адшчапенцаў, ласых на лёгкае жыццё.

Цэнтральны Камітэт нашай партыі звярнуў увагу камуністаў і ўсяго савецкага народа на каварную тактыку імперыялізму ў яго барацьбе супраць сацыялістычных краін. Пры гэтым было асабліва падкрэслена, што адказам на падрыўную дзейнасць імперыялістычнай прапаганды павінна быць непрымірымая барацьба з варожай ідэалогіяй, у якой бы форме яна ні выступала. Цэнтральны Камітэт КПСС заклікаў усямерна ўмацоўваць камуністычную перакананасць, патрыятызм і інтэрнацыяналізм савецкіх людзей, іх ідэйную стойкасць і ўменне процістаяць любым формам буржуазнага ўплыву.

Ход падзей у свеце за апошнія месяцы дастаткова пераканаўча паказаў, наколькі абгрунтавана і своечасова былі пастаўлены гэтыя задачы.

Дарагія юныя сябры! Наша партыя цвёрда ўпэўнена, што і ў ідэалагічнай барацьбе, якая разгарнулася паміж двума светамі, — як і ва ўсіх справах, — камсамольцы заўсёды будуць вернымі памочнікамі камуністаў. У гэтай барацьбе нашы людзі павінны быць ідэйна загартаваныя і цвёрдыя ў сваіх перакананнях.

Наша ідэйная зброя, сіла якой неадольная, бо гэта—зброя праўды, павінна быць заўсёды востра адточанай, павінна быць заўсёды напагатове.

Імперыялістам ніколі не расхістаць нашага маральна-палітычнага адзінства. Ідэолагам буржуазіі не ўдасца навязаць нашым людзям мараль свайго грамадства, дзе галоўная мерка ўсіх каштоўнасцей — прыватная ўласнасць, дзе пануюць воўчыя законы, духоўная і маральная спустошанасць. Імперыялізму няма чаго процістаўсіць вялікай сіле высакародных ідэй і грандыёзных мэт, якія натхняюць савецкіх людзей, нашу моладзь на подзвігі ў працы і барацьбе.

Мы моцныя тым, што за сацыялізмам і камунізмам будучыня. Мы моцныя тым, што служым вялікім гуманным мэтам, што ўся наша работа прысвечана служэнню народу, барацьбе за яго шчасце. Мы моцныя тым, што змагаемся ў імя ажыццяўлення самых светлых ідэалаў чалавецтва. І для камсамола няма задачы больш важнай, больш пачэснай, чым выхоўваць маладое пакаленне сваёй краіны сапраўднымі камуністамі, дастойнымі прадаўжальнікамі справы вялікага Леніна.

Дазвольце выказаць упэўненасць, што наш Ленінскі камсамол і ў далейшым будзе вырашаць гэтыя адказныя задачы гэтак жа ўмела, з такім жа запалам і энергіяй, як ён гэта рабіў на працягу ўсяго свайго існавання —ад агнявых заранкаў грамадзянскай вайны да нашых дзён, азораных святлом вялікага плана будаўніцтва камунізма.

Дарагія сябры!

Краіна наша, вялікі наш народ будуюць камунізм. Уваходзіць у яго светлы будынак, усталёўваць паміж людзьмі новыя адносіны, аб якіх тысячагоддзямі марылі лепшыя розумы чалавецтва, у імя якіх аддавалі жыццё многія пакаленні рэвалюцыянераў, — трэба будзе вам, сённяшнім камсамольцам Савецкай краіны. Але, каб дастойна выканаць гэтую гістарычную місію, трэба да яе добра падрыхтавацца. **Трэба вучыцца камунізму.**

Што гэта значыць у цяперашніх умовах?

Вучыцца камунізму — гэта значыць заўсёды імкнуцца быць актыўным удзельнікам камуністычнага будаўніцтва, каб твая праца— крыніца задавальнення і радасці жыцця для самога цябе зліваласа з працай тваіх таварышаў на агульную карысць. Гэта значыць заўсёды ставіць перад сабой мэту —стаць яшчэ больш кваліфікаваным работнікам, авалодваць усё новымі навуковымі і тэхнічнымі ведамі. Гэта значыць заўсёды шукаць новыя, яшчэ больш эфектыўныя шляхі ў вытворчасці.

Вучыцца камунізму — гэта значыць нястомна вывучаць тэорыю марксізма-ленінізма, выпрацоўваючы ў сабе яснае разуменне вялікай гістарычнай справы, за якую змагаюцца наша партыя і наш народ, цвёрдую ідэйную перакананасць у правільнасці гэтай барацьбы. Гэта значыць пастаянна развіваць у сабе класавую самасвядомасць, выхоўваць сябе на раваюцыйных традыцыях Камуністычнай партыі і рабочага класа ў духу непрымірымасці да класавых ворагаў і іх ідэалогіі. Гэта значыць вучыцца распазнаваць класавага ворага якой бы маскай ён ні прыкрываўся.

Вучыцца камунізму — гэта значыць актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, прывыкаць да кіравання грамадскімі справамі, заўсёды і ва ўсім адстойваць інтарэсы нашага грамадства, нашага народа, нашай дзяржавы.

Вучыцца камунізму — гэта значыць словам і справай, сваім асабістым прыкладам усталёўваць нормы камуністычнай маралі. Гэта значыць пастаянна павышаць свой культурны ўзровень, расшыраць свой кругагляд, абагачаць розум усё новымі і новымі ведамі са скарбніцы чалавечай культуры.

Вучыцца камунізму — гэта значыць выхоўваць сябе ў духу беззаветнага савецкага патрыятызму. Гэта значыць імкнуцца ўсімі сіламі садзейнічаць умацаванню магутнасці і росквіту нашай вялікай Радзімы. Гэта значыць як зрэнку вока берагчы маральна-палітычнае адзінства нашага грамадства, мацаваць дружбу народаў нашай краіны, быць непрымірымым да любых праяўленняў нацыяналізму. Гэта значыць заўсёды быць гатовым аддаць усе свае сілы, а калі запатрабуецца, і жыццё, за справу абароны сваёй Сацыялістычнай Радзімы, за шчасце свайго народа, за справу камунізма.

Вучыцца камунізму — гэта значыць выхоўваць сябе ў духу пралетарскага, сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, у духу брацкай дружбы з народамі сацыялістычных краін, баявога саюза з усімі барацьбітамі за справу міру і свабоды народаў, у духу класавай салідарнасці з працоўнымі ўсяго свету.

Такія задачы, што стаяць перад цяперашнім пакаленнем савецкай моладзі, перад шматмільённай арміяй маладых барацьбітоў за камунізм.

Каб вырашыць усе гэтыя задачы з гонарам, каб аказацца на вышыні патрабаванняў часу, наша моладзь павінна быць не толькі свядомай, адукаванай, культурнай, але і павінна мацаваць згуртаванасць сваіх радоў, сваю арганізацыю. Гэта натуральна. Ніводная армія, як бы добра яна ні была ўзброена, не атрымае перамогу, калі не будзе спаяна адзінствам волі, арганізацыі, дысцыпліны. Такое адзінства волі, такую згуртаванасць нашай моладзі забяспечвае верны памочнік партыі Леніна — Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі.

У гонар 50-годдзя камсамола ў нас па ўсёй краіне прайшло тое, што вы так добра назвалі Усесаюзным камсамольскім сходам. Юнакі і дзяўчаты на заводах, у калгасах і саўгасах, у навучальных установах і воінскіх часцях падводзілі вынікі юбілейнага спаборніцтва, рапартавалі аб сваіх поспехах, гаварылі аб тым, як камсамол рыхтуецца да сустрэчы вялікай даты— стагоддзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, выказвалі ўдзячнасць партыі за клопаты аб моладзі.

Гэта справядліва. Моладзі, камсамолу ёсць за што дзякаваць партыі. Але сёння, у дзень вашага юбілею, бывае да месца і нам, людзям старэйшага пакалення, ад імя трынаццаці з палавінай мільёнаў камуністаў нашай краіны аддаць належнае камсамолу за тую любоў, якую наша моладзь адчувае да Савецкай Радзімы, да ленінскай партыі, за той велізарны ўклад, які камсамол уносіць у будаўніцтва камунізма.

Камсамолія — якая гэта выдатная палітычная школа! Як шмат яна дала ўсім нам! Колькі актыўных змагароў за справу камунізма, колькі славутых на ўсю краіну майстроў індустрыяльнай і сельскагаспадарчай працы, колькі відных дзеячоў нашай партыі і дзяржавы, выдатных вучоных, канструктараў, палкаводцаў, карыфеяў літаратуры і мастацтва выйшла з камсамольскай школы! І цяпер, калі наш камсамол святкуе свой паўвекавы юбілей, мы ўсе гаворым яму з хваляваннем у сэрцы: дзякуй табе, слаўны сцяг нашага баявога юнацтва! Дзякуй табе, вечна бурлячы рэвалюцыйным энтузіязмам, запалам наватарства, беззаветнай энергіяй юнацтва саюз маладых ленінцаў! Будзь такім жа і ў далейшым, якім ты быў гэтыя 50 гадоў! Вядзі за сабой моладзь Краіны Саветаў на працу і на подзвіг пад сцягам партыі Леніна ў імя камунізма, у імя шчаслівай будучыні ўсяго чалавецтва!

Дазвольце, таварышы, зачытаць прывітанне Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

(Прамова таварыша Л. І. Брэжнева была выслухана з велізарнай увагай і неаднаразова перапынялася бурнымі працяглымі апладысментамі).

ДАРОГІ, ЯКІЯ МЫ ВЫБІРАЕМ

Фотагалерэя Р. КАДЗЕТА.



Паэтычная паверка 50

ВЛКСМ

Вольга ІПАТАВА

БАЛАДА ПРА САКРАТАРА

Памяці Алеся Савіцкага, першага сакратара камсамольскай арганізацыі Забалацкага сельскага Савета Гродзенскай вобласці, забітага бандытамі ў 1948 годзе.

Жнівеньскія ночы — трывожныя,
зорныя,
Пахнуць косы дзяўчат вадою
азёрнаю,
І матулі шчыльней зачыняюць
дзверы,
Пахне аерам...

Чаму ж ты хлапчыну гэтага, ноч,
не ўберагла!
Пад ім зямля папалам з крывёй,
ліпкая, як смала,
І неба, перад світаннем шэрае,
кружыцца ў вачах,
І цені, чорныя цені, здаецца,
нешта крычаць.
Ды не, не крычаць — баяцца ру-
жовай раніцы цені.
«Падыміце яго, гавораць,
пастаўце яго на калені.
Хай перад смерцю памоліцца
камсамолец».

...У садах маладыя яблыні,
шызыя ад расы.
Пахнуць мятай і верасам у дзяўчат
валасы.
Праз гады я з ім, семнаццаціга-
довым, крычу
Кожнай жылкай сваёй:
«Па-мі-раць не ха-чу!»
Толькі не — не крычу.
Ён тады не крычаў.
Адбіваўся світанак у сініх вачах,
І ў паветры апошняе слова
дрыжыць:
«Я памру, але будзе Улада
Савецкая жыць!»

... Паўтараю сягоння, як клятву,
ў душы:
«Я памру, але будзе Улада
Савецкая жыць!»

Алесь РАЗАНАЎ

КАМСАМОЛУ

Камсамол,
ты заўсёды ў паходзе, —
маладое краіны любоў!..
Агнявое тваё паўстагоддзе —
паўстагоддзе дарог і баёў.

Нашы душы —
табе не пацёмкі,
нашы рукі —
для справы людской,
і заўсёды тваёю пуцёўкай
будзе нам баявы неспакой.

Кожны дзень,
у складаным і простым,
у зямлі, расквітнеўшай наўкол,
пазнаю твой акрылены поступ,
палымянасць тваю,
Камсамол!

Жэня ЯНІШЧЫЦ

МІКОЛУ СУРНАЧОВУ

Лепшай долі сёння я не прагну.
Мілы край кранае аж да слёз.
Дай мне, вечнасць, мудрую
развагу
На любоў, на шчасце і на лёс.
Ідучы адзінаю дарогай,
Дзе гады ляцелі напралом,
Дай мне, век, упартасць перамогі
Над бяссіллем, цемраддзю і злом.
Знаю, кроў людская не вадзіца.
І таму цяпер без лішніх слоў
Дай мне, век, натхненнем
прычасціцца
Адгрымеўшых песень і баёў.
Я нясу любаві адданай слова
Ў край, што ў цяжкіх бітвах не
зачах.
І нязгаснай песняй Сурначова
Беларусь хвалюецца ў вачах.

■ ■ ■

Не адчуць юнаку
Жальбу-плач матулі.
Ой, кукуй не кукуй,
Шэрая зязюля.
І няма больш дарог.
Сціхніце, зязюлі.
Кроўю думак і трывог
Вышыта кашуля.
Гасне неба у вачах,
Дням не паўтарыцца.
Падавілася не ў час
Перапёлка ў жыце.
Божы дзень-ліхадзей
Абакраў, што злодзей.
Конь без конніка ў тузе...
Песня жытам ходзіць...

Ніна МАЦЯШ

КРЫНІЦЫ МУЖНАСЦІ

Брэсцкаму абкому камсамола.

...Было — як ноччу змрочнай
у дарозе:
Бязмоўна. Глуха. Страшна. Ты —
адзін...
І морак проста ў твар табе
глядзіць,
І кожны камень, кожны куст —
варожы...

Прыгаварона, як лісцё апалае,
Кружыў адчай абрыўкі ўсіх
надзей.
І раптам —
«Добры дзень, сястра! Я —
Паўка,
Карчагін. З Шапятоўкі... Добры
дзень!»
І нечакана —
«Мы к табе, сяброўка.
Ад камсамола. Як ты тут
жывеш!...»
О мужнасць, мужнасць! Вось твае
вытокі,
Вось дзе ты сілу чэрпаеш-бярэш!
Было — як ноччу змрочнай,
адзінокай.
Стаяла крукам роспач над душой.
...Як б'е з-за цёмнай хмары сонца
ў вокны!
З-за цёмнай хмары дзень які
ўзыйшоў!

Алесь КАМАРОЎСКІ

ПАДМУРАК ПАД НОВЫ ДОМ

Неба, грамамі бухні!
Пашлі беларускі дождж!
Не стыне да вечара ў кухні
Студэнцкі гарачы боршч.

Апалубка прагна рыпае,
Крэкча з вадою кадзь...
Кельма, блішчастаю рыбінай
Шурпатасць цэменту гладзь!

Носім раствор рыдлёўкай.
Стомы — дзесяткі тон...
Змацаваны дружбай і спёкай
Падмурак пад новы дом.

Казахстан. Цалінны край.

Леанід ЯКУБОВІЧ

ЗАЙЗДРОСЦЕ, ХЛОПЦЫ, САЛІГОРЦАМ!

Зайздросьце, хлопцы,
салігорцам —
Маім сябрам і землякам:
Трымалі іспыты па-геройску
На горды тытул гарняка!

Яны, як выклік сутарэнням,
Ідуць дарогамі вякоў,
Чытаюць хітрыя спляценні
Імі пакораных пластоў.

І што там іншыя прафесіі —
Для іх другіх не існуе.
Свае у шахце ёсць прафесары
І аспіранты ёсць свае.

Так, нездарма іх лічаць моцнымі,
Другія гэтак ці змаглі б —
Гаспадарамі паўнамоцнымі
І пад зямлёй, і на зямлі.

Зайздросьце, хлопцы,
салігорцам —
Маім сябрам і землякам!

г. Салігорск.

Казімір КАМЕЙША

БУДАЎНІКІ

Нямала нам прыйдзецца будаваць,
Больш, чым прыйшлося бедаваць.
Мы ўсё пабудуем, што ў планах
і думках
І нават чаго у думках няма.
Увекавечацца нашы душы
У гэтых вечных дамах.
Галоўнае, помнілі б толькі ўнукі
У свае наймудрэйшыя вякі
Пра гэтыя рукі, дужыя рукі,
Трымаўся магутны век на якіх.
І хай яны самі узводзяць ракетай
Паверхі ў звонкую, веснюю рань.
Мы ў згодзе ішлі, цесляры і паэты,
І гучна пакрыкваў на нас прараб.

ПЯЦЬДЗЕСЯТ ГЕРАІЧНЫХ ГАДОЎ

У Мінску, у Палацы спорту, 28 кастрычніка адбыўся ўрачысты пленум Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ, мінскіх абласнога і гарадскога камітэтаў камсамола, прысвечаны 50-годдзю ВЛКСМ.

Удзельнікі пленума гарачымі апладысментамі сустрэлі з'яўленне ў прэзідыуме кіраўнікоў Камуністычнай партыі і ўрада рэспублікі П. М. Машэрава, Ц. Я. Кісялёва, У. Е. Лабанка, І. М. Макарава, С. А. Пілатовіча, І. Я. Палякова, А. А. Смірнова, Ф. А. Сурганава, М. Н. Полазава, Г. М. Жабіцкага.

Пленум адкрыў першы сакратар ЦК ЛКСМБ Г. М. Жабіцкі.

Пад бурныя апладысменты выбіраецца ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС.

З прамовай перад удзельнікамі ўрачыстага пленума выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў.

Тав. Машэраў уручыў памятны сцяг ЦК КПБ на вечнае захоўванне рэспубліканскай камсамольскай арганізацыі. Першы сакратар Мінскага абкома КПБ І. Я. Палякоў уручыў памятны сцяг абкома партыі Мінскай абласной камсамольскай арганізацыі.

З дакладам «50 гадоў ВЛКСМ» выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ Г. М. Жабіцкі.

Удзельнікаў пленума ад імя ЦК ВЛКСМ вітаў загадчык аддзела ЦК ВЛКСМ В. Н. Шастакоўскі.

Ад імя ветэранаў камсамола на пленуме выступіў дэлегат III з'езда РКСМ Н. В. Разанаў.

Урачысты пленум віталі прадстаўнікі рабочай моладзі нашай рэспублікі. Калі аркестр зайграў «Марш камуністычных брыгад», у залу ўвайшлі пасланцы слаўнага рабочага класа — шахцёры і хімікі, машынабудаўнікі і дываноўшчыкі, гадзіншчыкі і абутнікі, прадстаўнікі вялікай арміі працоўных рэзерваў. З прамовай выступіў слесар-выпрабавальнік Мінскага ордэна Леніна аўтамабільнага завода Леанід Шарамет.

Група маладых хлебаробаў падымаецца на сцэну і падносіць прэзідыуму на расшытым ручніку пышны, з падрумяненай скарынкай каравай, спечаны з мукі новага ўраджаю. Ад імя сельскай моладзі рэспублікі да ўдзельнікаў пленума звяртаецца звеннявая калгаса «50 год Кастрычніка» Маладзечанскага раёна Ніна Станевіч.

На сцэне прадстаўнікі маладой інтэлігенцыі. З прывітальнай прамовай выступае доктар навук, прафесар В. П. Платонаў.

Ад імя Ваеннага савета двойчы Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту ўдзельнікаў пленума вітаў капітан-лейтэнант І. Н. Мядзведзеў.

Маладыя, з вясёлымі бадзёрымі ўсмешкамі ўвайшлі ў залу вітаць урачысты пленум пасланцы студэнцкай моладзі рэспублікі.

Старшынствуючы аб'яўляе: урачысты пленум прыйшлі вітаць доблесныя воіны Савецкай Арміі.

Ад імя воінаў выступае памочнік начальніка Палітупраўлення ЧБВА па камсамольскай рабоце маёр Э. Н. Капусцін.

Удзельнікаў пленума ад Групы Савецкіх Войск у Германіі вітаў капітан В. Г. Гладкі. Ён расказаў аб поспехах армейскага камсамола ў гонар 50-годдзя ВЛКСМ і запэўніў, што савецкія воіны будуць і ў далейшым пільна стаяць на варце заваёў Вялікага Кастрычніка.

З прывітаннямі на пленуме выступілі: ад аўстралійскай моладзі — прадстаўнік Маладзёжнай сацыялістычнай лігі Аўстраліі ў бюро Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі Бэры Блеарс, ад індыйскай моладзі — генеральны сакратар Усеіндыйскай федэрацыі моладзі і студэнтаў Ч. К. Чандрапан.

І зноў барабанны пошчак узляцеў да скляпенняў Палаца спорту — вітаць сваіх старэйшых таварышаў прыйшлі юныя ленінцы, піянеры сталіцы Беларусі.

Юныя ленінцы пад бурныя апладысменты ўручаюць зробленыя сваімі рукамі падарункі прэзідыуму, удзельнікам урачыстага пленума.

На пленуме зачытаны прывітанні і тэлеграмы, якія паступілі ў адрас рэспубліканскай камсамольскай арганізацыі, у адрас урачыстага пасяджэння.

З вялікім уздымам сустракае зала прапанову пасласць пісьмо-рапарт Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Урачысты пленум аб'яўляецца закрытым.

Зала стоячы спявае «Інтэрнацыянал».

У заключэнне адбыўся вялікі святочны канцэрт.

БЕЛТА.

ГАСПАДАРЫ НОВАГА ДНЯ

Сяргей ГРАХОЎСКІ

ПОБАЧ з кожным сталым пакаленнем ідзе маладосць. Яна — надзея, яна — будучае чалавецтва. У кожнага новага пакалення ёсць падабенства з папярэднікамі, ёсць свае адметныя і непаўторныя рысы.

У савецкай моладзі—свая асобая аснова характару, свой галоўны стрыжань існасці, свая філасофія імкненняў, паводзін і ўчынкаў. Пачатак гэтай сутнасці ідзе ад першых камуністаў і камсамольцаў, чые лёсы апаліла і загартавала полымя баёў за Уладу Саветаў, за наш сённяшні дзень.

Сёння Ленінскаму камсамолу пяцьдзесят гадоў. Гэта мала і многа. Мала па часе, многа па здзейсненым і здабытым. Мы помнім першых камсамольцаў у кажушках і будзёнаўках, з вінтоўкамі і пачкамі газет, з гранатамі і тэкстамі палымяных ленінскіх прамоў. Мы ўспамінаем камсамольцаў, распятых бандытамі і знявечаных кулакамі.

Сёння мы сустракаем камсамольцаў на грэбнях нябачаных у свеце плацін, на атамных рэактарах, на рыштаваннях новых гарадоў, у цішы лабараторый, на лясных і горных заставах нашай Радзімы. Яны падобныя і непадобныя на сваіх папярэднікаў. Іх адрозніваё ад першых высокі інтэлект, маштабнасць мыслення, узброенасць самымі разнастайнымі ведамі. Іх аб'ядноўвае бязмежная адданасць запаветам Леніна, народу, сацыялістычнай Айчыне, нязгаслы камсамольскі запал, ненатольная прага пазнання, патомнае жаданне быць там, дзе цяжэй, ствараць новае і грандыёзнае.

Гэтыя рысы, памножаныя і загартаваныя часам і вопытам чалавецтва, праявяцца ў камсамольцаў, што прыйдуць на свой стогадовы юбілей.

Кам-са-мо-лец. Гэтае слова я ўпершыню пачуў снежаньскім адвячоркам 1918 года. Яго шэптам перадавалі з вуснаў у вусны. У кірмашовы дзень у нашым далёкім ад вялікіх дарог Глуску на базарную плошчу белапалякі вывалаклі сына мясцовага ганчара Міцю Жыжкевіча. Яму завязалі вочы і паставілі да сцяны адзінае ў мястэчку цаглянае крамы. Юнак сарваў павязку з вачэй. Яго апошняе слова: «Няхай жыве рэвалю...» абарваў стрэл з маленькага блішчастага пісталета. Першага глускага камсамольца па даносу ксяндза расстралялі на вачах соцень людзей: хацелі запалохаць жывых. А выклікалі гнеў, нянавісць і нязломную мужнасць. Аднагодкі Міці Жыжкевіча станавіліся барацьбітамі і мсціўцамі, падпольшчыкамі і партызанамі. Для нас, хлапчукоў, слова камсамолец было сімвалам мужнасці і сумленнасці, кожнаму хацелася быць такім, як Міця і яго сябры. Мы ведалі пра іх адвагу і няўлоўнасць.

Калі прыйшло вызваленне, зашумелі, загаманілі, заспрачаліся, заспявалі камсамольскія ячэйкі і клубы. Замільгалі чырвоныя касынкі і зорныя будзёнаўкі. Камсамольскія атрады ЧАПа ганяліся за белабандытамі, вартавалі спакой мястэчка, а вечарамі ў пажарным дэпо ставілі спектаклі, дэкламавалі вершы і спявалі «Мы — кавалі, куём мы шчасце для ясных будучых часін». І тут жа па трывозе зноў сядлалі коней, імчаліся ў Балашэвічы ці ў Бярозаўку шукаць бандытаў. На вясковых плошчах урачыста хавалі забітых селькораў, камсамольцаў, кляліся адпомсціць за смерць сяброў.

У жалобныя студзеньскія дні 1924 года камсамольцы прывялі на сцэну нардома больш за сотню хлапчукоў і дзяўчынак — сваю будучую змену. Застылі парэпаныя ручкі ў салюце, натхнёна гарэлі вочы. У цішыні залы, як клятва на ўсё жыццё, гучала: «Я, юны піянер, урачыста абяцаю...» Дачасна пасівелы ў баях Іван Мазалеўскі ад імя партыі прымаў нашу клятву на вернасць справе Леніна. Мы выканалі сваё ўрачыстае абяцанне, усім жыццём давялі адданасць Радзіме. Тады мы марылі хутчэй вырасці, атрымаць камсамольскі білет, зачыталіся радкамі Паўлюка Труса пра камсамольца Якіма, натхнёна дэкламавалі чаротаўскае:

Дзецям будучай камуны
Сонца ясны шле прамень,
Песню славы граюць струны,
Іх вітае новы дзень.

Новы дзень нашага камсамольскага юнацтва надышоў, акрылены летуценнямі і асветлены рамантыкай нязведаных дарог. Днепрагэс, Магнітка, Камсамольск-на-Амуры, палатка і таежнае вогнішча клікалі нас. Адны з камсамольскімі пуцёўкамі ехалі на Усход, другія — у суседні Бабруйск ці ў Арэхаўку будаваць «гіганты першай пяцігодкі». Камсамольцы былі ўдарнай брыгадай вялікіх і малых будоўляў краіны, першапраходцамі нязведаных дарог.

У чэрвені 1962 года быў я ў святочным Камсамольску-на-Амуры. Першабудаўнікі і жыхары Камсамольска адзначалі трыццатую гадавіну свайго юнага горада. Прыехалі тыя, хто на гэтым месцы валіў тайгу, ставіў першыя палаткі і баракі, закладваў падмуркі горада юнацтва. Пасівелыя Машы і Колі, Валодзі і Пеці спрабавалі знайсці колішнія прасекі, а знаходзілі новыя палацы, школы і праспекты. Іх ужо называлі «бабкамі» і «дзядулямі», у іх былі салідныя пасады або пенсіі, але яны назаўсёды засталіся камсамольцамі па душы, па характарах, па апантанасці, уласцівых гэтаму нязломнаму пакаленню. Сярод іх быў колішні барысаўскі камсамолец Акім Язэпавіч Акуліч. Ён стаяў на варце далёкаўсходняй граніцы, будаваў дамы, брукаваў дарогі, варыў сталь, а ў сорак першым праводзіў сыноў і іх аднагодкаў на свяшчэнную вайну.

Дзеці камсамольцаў дваццатых гадоў праславілі сваё пакаленне подзвігамі маладагвардзейцаў, Зоі Касмадзям'янскай, Аляксандра Матросава, Рымы Шаршнёвай, обальскіх падпольшчыкаў, тысяч маладых воінаў і партызан. Колькі юнакоў і дзяўчат, як паходні, пранеслі свае палымяныя сэрцы праз свінцовыя сцюжы вайны, колькі легендарных старонак упісалі камсамольцы саракавых гадоў у летапіс гераізму нашага народа. Яны не толькі перанялі лепшыя рысы бацькоў, яны памножылі славу ленінскай гвардыі на ўласны гераізм, жыццём і крывёю адстаялі нашу свабоду. Яны для сучаснікаў і нашчадкаў засталіся жывым узорам адданасці, мужнасці і непераможнасці.

Такою выхавала нашу моладзь Камуністычная партыя, загартавала яе ў вечна жывым дыханні ленінскай мудрасці і праўды. Такою яна будзе вечна.

Мы часам у сумятні будняў не заўважаем сілы, таленту, трываласці, настойлівасці і працавітасці нашых маладых сучаснікаў. Сапраўды, на адлегласці ўсё відней і выразней. Мінуць гады і, як легенду, будуць расказваць пра камсамольцаў Цаліннага краю, пра бетоншчыкаў Брацка і Ангарска, пра будаўнікоў Наваполацка і Салігорска, Светлагорска і Белазёрска.

За апошнія дзесяцігоддзі на прасторах Радзімы ад Брэста і да Ціхага акіяна вырасла 185 новых гарадоў і 800 рабочых пасёлкаў. Іх будавала моладзь, камсамольцы другой паловы нашага неспакойнага і слаўнага стагоддзя. Лёгка сказаць: будавала, будуе, узвядзе. А якога напружання фізічных і духоўных сіл патрабуе кожная будоўля, што пачынаецца з палаткі і завяршаецца сотнямі шматпавярховых дамоў, шырокімі праспектамі і маладымі паркамі, колькі энтузіязму і веры патрабуецца ад кожнага юнака і дзяўчыны, якія бяруцца за рыдлёўку і кельму.

Я добра ведаю першых будаўнікоў Наваполацка, я разам з імі жыў у бараках, мясіў багну там, дзе цяпер свеціцца морам агнёў гігант беларускай хіміі, дзе ўзняўся цудоўны горад маладосці. Я ведаю, чаго яны варты. Няма ім цаны, няма межаў іх магчымасцям і здольнасцям. Першыя бетоншчыкі і муляры сталі інжынерамі, тэхнолагамі, начальнікамі цэхаў і змен. Яны цяпер расказваюць сваім дзецям пра першыя крокі і першыя выпрабаванні на гэтай зямлі.

А колькі таленавітых паэтаў, фізікаў, музыкантаў, мастакоў, рэжысёраў, артыстаў вырасла за апошнія дзесяцігоддзе! Іх выхаваў камсамол, іх акрыліла, ім дала пуцёўку ў жыццё партыя камуністаў.

Ленінскаму камуністычнаму саюзу моладзі 50 гадоў. Гэта свята не толькі юных, гэта наша агульнае свята, свята тых, хто быў малады, хто ў душы назаўсёды застаўся камсамольцам, свята тых, хто заўтра атрымае чырвоны білет з профілем Ільіча, каб упэўнена ісці далей і вышэй.

Юбілей камсамола — гэта старт у новае паўстагоддзе вялікіх здзяйсненняў, працяг эстафеты пакаленняў, свята вечнай маладосці. Мы глядзім з радасцю, зайздрасцю і надзеяй на цябе, наша змена. Ідзі ўпэўнена і смела па самай яснай ленінскай дарозе. Ідзі! Будучыня належыць табе!

МАЛАДОСЦЬ У ПАХОДЗЕ

Бывае, што лёс зводзіць нас з людзьмі, якія пакідаюць яркі след у нашым жыцці. Такім чалавекам быў для мяне Платон Галавач. Кожны раз, калі я дастаю з альбома старую фатаграфію, на якой сярод маіх колішніх сяброў, як жывы, усміхаецца наш Платоша, сэрца сціскаецца ад хвалявання, і мімаволі ўспамінаецца той далёкі і трывожны час нашага юнацтва.

Платону Галавачу сёлета стукнула б 65 гадоў. І калі б ён жыў, дык мы разам з ім адзначылі б яшчэ адну знамянальную дату — 20 жніўня споўнілася 48 гадоў з дня стварэння камсамольскай ячэйкі ў вёсцы Гарбацэвічы, што на Бабруйшчыне, адным з арганізатараў якой быў Галавач.

Неяк пазней, ужо ў сярэдзіне дваццатых гадоў, Платон, успамінаючы Гарбацэвічы, пісаў: «Сходы моладзі прыходзілася праводзіць употай у памяшканні лазні. Але, нягледзячы на гэта, работу праводзілі паспяхова».

Я памятаю адзін такі сход. Мы сабраліся ў лазні, што стаяла ў лясочку ля хутарка, дзе жыў Галавач. Хоць і лічылі сябе дужа вопытнымі канспіратарамі, бацька аднаго з нашых таварышаў — Грышы Галавача — даведаўся пра сход і, уварваўшыся ў лазню з сякерай, кінуўся да сына. Пачалася тузаніна. Але мы не спалохаліся, і Грыша застаўся з намі. Потым ён запісаўся ў Чырвоную Армію, скончыў там лётную школу і ў гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў авіяцыйным палком. На фронце Грышу цяжка паранила і ён ледзьве дацягнуў да 1954 года.

Той памятны для нас сход у закуранай лазні пастанавіў прасіць Бабруйскі штаб Часцей Асобага Прызначэння прыняць у свае рады ўсіх камсамольцаў і выдаць ім зброю для барацьбы з бандытамі. У другой пастанове гэтага сходу мне і Андрэю Бародзічу даручалася арганізаваць у школе дыспут на тэму «Рэлігія — опіум для народа».

Маладосць, маладосць... Якой апантанай, дзёрзкай, поўнай трывог і барацьбы была яна ў нас. Тыя, каму Кастрычнік стаў папярок горла, не так лёгка саступалі нам дарогу. Яны засеклі брата Платона Галавача — камуніста Кузьму Раманавіча, забілі старога бацьку камсамольца Яўсея Рухаўца і адважных камсамольцаў Ілью Сінкаўца і Мішу Патоцкага, якім зараз пастаўлены помнік у Гарбацэвічах.

Але мы, іх сябры, разам са сваім важаком Платонам Галавачом не падалі духам, пасля кожнай цяжкай страты яшчэ больш рашуча змагаліся за новае жыццё.

На ўсё жыццё запомнілася мне і тая вераснёўская ноч 1921 года, калі раптам на Гарбацэвічы напала банда былога царскага капітана Караткевіча. Камуністы і камсамольцы на чале з Платонам кінуліся ў няроўны бой (бандытаў было больш за 200 чалавек). Браты — камуніст Іван і камсамолец Пятро Гарбузы падстрэлілі самога атамана. Банда адразу разбеглася.

Неўзабаве Платон Галавач становіцца байцом Часцей Асобага Прызначэння і памагае ліквідаваць белыя банды, што яшчэ бадзяліся па лясах і балотах Беларусі.

У 1923 годзе ў нашай вёсцы быў арганізаваны першы калгас на Бабруйшчыне. Называўся ён «Муравей».

Памятаю, як Платон хадзіў тады па сялянскіх хатах і расказваў вяскоўцам пра Леніна, пра палітыку Камуністычнай партыі. Людзі цягнуліся да юнака, да яго палымянага слова.

Якраз у гэтую пару выявіўся літаратурны талент Платона Галавача. У розных газетах друкаваліся яго карэспандэнцыі і фельетоны, у якіх ён выкрываў ворагаў Савецкага ладу. Шмат пісаў Галавач пра работу камсамола ў вёсцы.

Нашыя з Платонам жыццёвыя сцежкі яшчэ многа разоў сыходзіліся і пазней, калі мы выйшлі, як кажуць, у шырокі свет. Але нават калі я быў і далёка ад майго слаўнага сябра, я не пераставаў любіць яго. А з якім захапленнем, з якой радасцю ўзяў я ў рукі яго першы зборнік апавяданняў «Дробязі жыцця». Чытаючы гэты зборнік, я знаходзіў у ім шмат знаёмага, перажытага ў тыя бурныя дні.

Так, ён быў не толькі маім сябрам, ён быў і па гэты дзень застаецца маім любімым пісьменнікам. Яшчэ і яшчэ раз я перачытваю яго «Спалох на загонах», «Праз гады», «Яны не пройдуць». За вобразамі многіх герояў гэтых кніг паўстаюць перада мной людзі нязломнай волі, людзі, апантаныя вялікай ленінскай ідэяй, людзі маёй маладосці. І сярод іх ён сам — Платон Галавач.

А цяпер я крыху раскажу, як паявіўся фотаздымак, які я прапаную ўвазе чытачоў «Літаратуры і мастацтва».

У красавіку 1928 года адбыўся XI з'езд ЛКСМБ. На гэтым з'ездзе Платон Галавач быў выбраны першым сакратаром ЦК камсамола Беларусі і адначасова зацверджаны адказным рэдактарам газеты «Чырвоная змена».

Назаўтра, пасля заканчэння работы з'езда, група членаў ЦК ЛКСМБ, паплечнікаў Галавача па камсамольскай рабоце на Бабруйшчыне ў цяжкім і трывожным 1920 годзе, рашыла сфатаграфавацца. Першы справа на здымку — Платон Галавач. Побач — член бюро ЦК ЛКСМБ Мікалай Адзінец, які зараз дацэнт Сімферопальскага педінстытута, за ім — Віктар Войнаў, тады сакратар Магілёўскага акружнога камітэта ЛКСМБ, чацвёрты — аўтар гэтых радкоў, у той час член бюро ЦК ЛКСМБ, і Пётр Пячонка, інструктар ЦК камсамола. Пятра таксама ўжо няма, ён загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны пад Клімавічамі.

Мне ўжо нямала гадоў, а вось успомніў сяброў-таварышаў па далёкім юнацтве і як бы адразу памаладзеў. Так, людзям майго пакалення ёсць што ўспомніць, ёсць чым ганарыцца. Пра гэта я заўсёды думаю, калі сустракаюся з цяперашняй моладдзю, якая, быццам эстафету, пераняла ад камсамольцаў дваццатых гадоў цудоўную спадчыну. Гэта — крыштальная чэснасць, любоў да Радзімы, адданасць справе Леніна.

І. ГАЛАДКО,
дацэнт Стаўрапольскага сельскагаспадарчага інстытута.



Ускраіна лесу. Жэня, Расціслаў і Павел услухоўваюцца ў чутны з вышыні гул самалёта.

ЖЭНЯ. Чуеце? *(Махае рукой).* Мы тут, Валюшак!

ПАВЕЛ. Рэактыўны. Яна такіх і ў вочы не бачыла.

РАСЦІСЛАЎ. Божухна! Ну хоць трошкі фантазіі, магістр! Куды ты дзела ляльку, Жэка?

Надзявае на пальцы вялікую ляльку ў лётчыцкім адзенні. Лялька таксама махае самалёту.

ПАВЕЛ *(упарта).* Рэактыўных тады не было! Калі б яна пайшла на рэактыўным, насыпалі б ёй солі на хвост тыя зеніткі!

ЖЭНЯ. Валюшак у палёце, Паўлік!

РАСЦІСЛАЎ. Ён стаў салідны вучоны, Жэка! Ён не помніць нашу юнацкую дамоўленасць.

ПАВЕЛ. Усё я помню, Расціслаў. Занадта добра... Але ўсё-такі—чаму ў нас не было тады рэактыўных самалётаў!

Нейкі час усе маўчаць. Гул самалёта мацнее.

ЖЭНЯ. Садзіся, Валюшак. Пазнаёмлю цябе з дачкой. Яе завуць, як і цябе—Валя.

ПАВЕЛ. Спускайся, Валёк. Пасадачная пляцоўка вольная. Заўсёды.

РАСЦІСЛАЎ *(ціха).* Даруй мне, Павел.

Павел махае рукой, адыходзіць.

ЖЭНЯ. Мая дачка ўжо дарослая, Валюшак. Ёй дваццаць два. Бачыш, мы сталі старыя!

РАСЦІСЛАЎ. А табе па-ранейшаму дваццаць адзін. Назаўсёды... *(Чытае верш).*

Я стою перед жизнью
огромной и сложной.
В эту жизнь я завтра должна вступить...

ЖЭНЯ. Дачка працуе ў музеі. Там вісіць твой вялізны партрэт. І Валя кожны дзень расказвае пра цябе людзям. Усё, што мы ёй расказвалі. Якой ты была.

Гул самалёта вельмі моцны. Такое ўражанне, нібы ён недзе блізка [illegible]. Прамень святла выхоплівае спачатку твар, потым усю постаць Валі—такою, якою мы ўбачым яе ў фінале.

ВАЛЯ. Уяўляю, што там за партрэт! Хто яго даваў—ты?

ЖЭНЯ. Ён зроблен з фатаграфіі, якую ты падпісала Расціславу. Расціславу ты не магла падарыць фатаграфію, якая табе не падабалася б.

ВАЛЯ. І няпраўда! І няпраўда! Проста гэтай мне не было шкада—у Пашкі захаваўся негатыў. А картка якраз і няважная атрымалася. Помніш, як Паўлік яе рабіў?

ЖЭНЯ. Помню, Валюшак, добра помню.

Асвятляецца глыбіня сцэны. Па нейкіх дэталях глядач здагадваецца, што дзея пераносіцца на аэрадром ваеннага часу. Павел у салдацкай гімнасцёрцы завіхаецца ля ўстаноўленага на штатыве фотаапарата.

ПАВЕЛ. Атрымліваю пасылку і ўцяміць нічога не магу—падручнікі, сшыткі. Здзяцінеў, думаю, прафесар ці што. Ажно чытаю: «Ваш камандзір паабяцаў мне, наколькі дазволяць умовы, спрыяць вашым занятказ». І смешна, і плакаць хочацца.

ЖЭНЯ *(з-за сцэны).* Падпалкоўнік спытаў мяне тады—гэты прафесар не сваяк вашаму акулярыку? Давялося расказаць, як Рыбачук яшчэ ў палацы піянераў запісаў цябе ў вундэркінды.

ПАВЕЛ. А плёнка, піша, гэта вам на дзень нараджэння. Успомніў, мусіць, як я ўцякаў ад яго здымаць вясновыя эцюды.

ВАЛЯ *(з-за сцэны).* Не вясновыя эцюды, а мяне!

ЖЭНЯ. Валюшак, гэта ўсім было вядома. Нават Рыбачуку.

ВАЛЯ. Ён так сярдзіта глядзеў на мяне на лекцыях!.. Паўлік, а можа ты сапраўды які неафіцыйны сын Рыбачука? Як Артур—сын Мантанелі.

ПАВЕЛ. Ты не лічыш, Жэня, што на добрае імя маёй маці зроблены замах?

ЖЭНЯ. Лічу, Паўлік. І ты павінен адказаць на гэта, як сапраўдны мужчына.

Павел імітуе ўдар шпагай.

ВАЛЯ. Паўлік, ты мужчына?

ПАВЕЛ. Здымкі, здаецца, не адбудзецца.

Выскоквае Жэня. На хаду прыгладжвае валасы. На ёй афіцэрская форма, лейтэнанцкія пятліцы.

ЖЭНЯ. Паўлічак, не ўздумай! Ты мужчына, ты ідэальны мужчына! Бачыш, я нават саромеюся пры табе прычэсвацца і пудрыцца.

Выходзіць Валя. На ёй таксама форма. Толькі пятліцы—сержанцкія.

ВАЛЯ. Сагразіў! Магу і не здымацца. Паглядзім, хто каго папросіць.

ЖЭНЯ. Ты жорсткі чалавек, Валюшак. А ты, Паўлічак, таксама вінаваты. Колькі разоў табе казала—болей гордасці.

ВАЛЯ. Нічога твая навука не дала. І не дасць. Як на выпускным—вучыла, вучыла, а ён адно хапіў шклянку партвейну і палез выкручваць электрапробкі, каб я не танцавала болей з Віцькам Лемяшонкам.

ПАВЕЛ. Прадстаўленне закончана—збіраю штатыў.

ЖЭНЯ. Паўлік, Паўлік, я ж столькі пудры патраціла! Думаеш, лёгка ў ваенны час знайсці пудру! Станавіся, Валюшак.

ВАЛЯ. Хітрая ты, Жэка. Сапраўдная ліса! Недзе я чытала, што Яўгенія—значыць, высакародная. Па-грэчаску. А ты хіба высакародная?

ЖЭНЯ. З Паўлікам кончыла, узялася за мяне?

ВАЛЯ. Ты знарок заўсёды робіш, каб мы здымаліся стоячы. Усе потым гавораць: «Ой, якая ты, Валюшак, маляўка побач з Жэкай!»—а ты і цвіцеш.

ЖЭНЯ. Паўлічак, здымай мяне адну.

ВАЛЯ. Але, калі па праўдзе, дзяўчаты толькі пры табе так гавораць. Каб не пакрыўдзіць начальства. А без цябе гавораць інакш: «Ой, якая, Валюшак, Жэка побач з табой каланча!»

ПАВЕЛ. Трошкі вышэй падбародак. І правей глядзі.

Здымае. Жэня прымае наступную позу. Валя яе перадражнівае. Жэня робіць выгляд, што нічога не заўважае.

ВАЛЯ. І правільна гавораць. Бо доўгі рост для жанчыны зусім непрыгожа. У класікаў высокія—заўсёды непрывабныя. Помніш, у Чэхава: «Каля яго стаяла высокая тонкая англічанка з пукатымі рачымі вачыма і вялікім птушыным носам...»

Жэня не адказвае.

ВАЛЯ. А пра маленькіх у класікаў—заўсёды з сімпатыяй: «Гэта маленькая жанчына, нічым непрыкметная... напаўняла цяпер усё яго жыццё, была яго горам, радасцю, адзіным шчасцем...» Той самы Чэхаў, «Дама з сабачкам».

ПАВЕЛ. Элачка-людаедка.

ВАЛЯ. Хто—Элачка-людаедка?!

ПАВЕЛ. Ніхто. Проста ўспомніў. «Рост Элачкі цешыў мужчын. Яна была маленькая, і нават самыя плюгавыя мужчыны побач з ёю выглядалі асілкамі». Цытата даслоўная.

ЖЭНЯ. Брава, Паўлічак!

ВАЛЯ. Падумаеш, укусіў! Я пра класікаў кажу, а Ільф і Пятроў хіба класікі?

ПАВЕЛ. Як для каго.

ВАЛЯ. Не класікі!

ПАВЕЛ. Дык я ж нічога не кажу. Проста ўспомніў.

Паўза.

ВАЛЯ. Калі хочаце ведаць, я стала не такая ўжо маленькая. Мой рост цяпер толькі трошачкі ніжэй сярэдняга.

Пачынае камбінацыю спартыўных практыкаванняў.

ПАВЕЛ. Паветраныя замкі з індывідуальнымі гародамі!

ВАЛЯ. А от і праўда! Памерала сёння ў ваенгандлі спадніцу—сорак чацвёрты памер, другі рост, як у Мінску насіла—а яна мне кароткая. Я адразу ў санбат—ура, на цэлыя чатыры сантыметры вырасла!

Жэня маўчыць.

Ведаеш, Жэка, што я перш-наперш зрабіла б, калі б мы раптам апынуліся ў Мінску? Адшукала б урача з твайго аэраклуба. Вось, сказала б, доктар, вы не прынялі мяне з-за росту ў аэраклуб. Вы смяяліся, калі я папрасіла параіць практыкаванні—толькі дзеля адчэпнага далі комплекс для карэгіравання росту падлеткаў. А я ўсё роўна тры гады, як чумная, выкручвала сабе ногі. І вось вам, доктар, і лятаю, і вырасла!.. Праўда, Жэка! Чаго ты маўчыш?

ЖЭНЯ. Высокая, тонкая, з пукатымі рачымі вачыма...

ВАЛЯ. Жэка, дурненькая, няўжо пакрыўдзілася?

ПАВЕЛ *(у тон Валі).* Жэка, тваё ж імя азначае «высакародная»!

ЖЭНЯ. Дзякую, Паўлічак. Хопіць. *(Да Валі).* Штурман Галубовіч не забылася—у дваццаць тры ноль-ноль ваш вылет.

ВАЛЯ *(выцягваецца).* У дваццаць тры ноль-ноль, таварыш старшы лейтэнант.

Жэня выходзіць.

Жэка... Жэка!.. Пакрыўдзілася.

ПАВЕЛ. І з чаго? Ты такая з ёю мілая, далікатная, ураўнаважаная — ідэальны характар.

ВАЛЯ. Сып, карыстайся момантам.

ПАВЕЛ. З кім сёння ляціш, ідэальны характар?

ВАЛЯ. З Сімай Ісаевай. Харошая яна, Сіма. Паважае мяне, слухаецца. Не корчыць з сябе ў палёце начальства.

ПАВЕЛ. Павярніся трошкі ўлева. Ад ценю.

ВАЛЯ. Ай, Пашка, здымай, як ёсць. Няма нешта настрою. І наогул успомніла.

ПАВЕЛ. Што?

ВАЛЯ. Той дзядуля доктар з аэраклуба—яўрэй. Калі з Мінска не эвакуіраваўся, яго, хутчэй за ўсё, забілі...

Ускраіна лесу. Жэня і Расціслаў.

ЖЭНЯ. Звычайна на фота Валюшак не дужа атрымлівалася. У школе нават плакала—пойдзем усім класам здымацца, а яна напалоханая выходзіць, або ўсмешка такая, нібы дражніць каго. А Паўлік тады схапіў—я аж уздрыгваю, як заходжу ў музей.

Уладзімір Мехаў

Палёт

Урывак з п'есы

Напісаў п'есу «Палёт» — нешта накшталт драматычнай навелы, калі гаварыць пра яе жанр, а ўвогуле роздум пра людзей, якіх з намі няма і якія ў той жа час заўсёды з намі: іх палёт у нашых сэрцах вечны. У пэўнай ступені правобразам гераіні п'есы Валі Галубовіч з'яўляецца адважная гомельская камсамолка лётчыца Галіна Дакутовіч. Яе светлай памяці і прысвечана п'еса.

П'есай зацікавіўся Рэспубліканскі тэатр юнага гледача.

Эпізоды, якія ніжэй друкуюцца,— пачатак п'есы.

Аўтар.

РАСЦІСЛАЎ. Быў і я нядаўна ў музеі. Стаяў, глядзеў, успамінаў.

ЖЭНЯ. Гаварыла красуня мая.

РАСЦІСЛАЎ. Як выступаў я, расказвала?

ЖЭНЯ. Словы два-тры. Яна са мной не дужа гаваркая.

РАСЦІСЛАЎ. Апошнім часам часта выступаю. Дырэкцыя нават афішу спецыяльную заказала: «Перад спектаклем выступіць артыст нашага тэатра, герой такога і такога кінафільмаў».

ЖЭНЯ. Бачыла, не хваліся.

РАСЦІСЛАЎ. Клюе, паміж іншым, публіка. Асабліва на выязных... А ў музеі абурыўся я: запрасілі, каб расказаў студэнтам пра Валюшка, а яны ў запісках адно пра фільмы пытаюць — як у гэтым здымаліся, ды як у гэтым. Аж раззлаваўся я, далібог.

ЖЭНЯ. Што ты хочаш! Гэта нам з табой вайна — назаўсёды вайна. А ім? Яны ж мо толькі нарадзіліся ў сорак восьмым ці сорак дзевятым... Божухна, якія мы старыя! Табе — сорак сем?

РАСЦІСЛАЎ. Каля таго.

ЖЭНЯ. І мне ўжо сорак пяць адстукала. Сорак пяць! Страшна падумаць.

РАСЦІСЛАЎ. Глупства. Мы сваё будзь здароў як прыгожа пражылі. Хай яны паспрабуюць — сорак восьмага ды сорак дзевятага гадоў нараджэння.

ЖЭНЯ. Плюнь тры разы! Няўжо свайму сыну пажадаеш страхоцця паспытаць, што сам паспытаў?

РАСЦІСЛАЎ. Дык хай памятаюць, хай удзячны будуць, што зберaглі іх ад гэтага і беражом!

ЖЭНЯ. Бурклівы з цябе свёкар будзе, Расціслаў!

РАСЦІСЛАЎ. Хай моляцца на такіх, як Валюшак! Цяпер такіх няма. Святыя гэта былі людзі, святыя!

ЖЭНЯ. Валюшак — святая?

РАСЦІСЛАЎ. А што скажаш — не?

ЖЭНЯ. Падумаць трэба... Трэба падумаць, Расціслаў.

Асвятляецца глыбіня сцэны. Зноў аэрадром. Павел памагае Валі зняць камбінезон.

ВАЛЯ. Моцна падпалкоўнік лаяўся?

ПАВЕЛ. Было. Разганю, казаў, увесь гэты кірмаш нявест.

ВАЛЯ. А Жэня?

ПАВЕЛ. Абараняла. Казала, што вы, відаць, усё як след разлічылі.

ВАЛЯ. Не ўсё. Што там столькі зенітак — не спадзяваліся.

ПАВЕЛ. Як вы дацягнулі назад — рады не дам. Восем прабоін. Перабіты ланжэрон, у гаргроце дзірка.

ВАЛЯ. Восем прабоін! Яшчэ ні ў каго з дзяўчат столькі не было. Першы сапраўдны вылет сярод жаночых экіпажаў!.. Ой, Жэка... Адыдзі, Пашка. Падалей ад граху.

Павел адыходзіць. Уваходзіць Жэня.

ЖЭНЯ. Старшы сяржант Галубовіч! Малодшы лейтэнант Ісаева прызналася, што гэта вы ўгаварылі яе адхіліцца ад зваротнага курсу і зрабіць непрадугледжаны загадам налёт на чыгуначны вузел.

ВАЛЯ. Раскалолася Сіма-Серафіма.

ЖЭНЯ. Як вы стаіце перад камандзірам! Смірна! З якога лексікону гэта слова — раскалолася? Малодшы лейтэнат Ісаева павінілася, бо камандзір палка загадаў на два тыдні не дапускаць яе да палётаў.

ВАЛЯ. На два тыдні! Несправядліва гэта. У мужчынскіх экіпажах за такі налёт прадстаўляюць да ўрадавых узнагарод.

ЖЭНЯ. Узнагароды захацелася?

ВАЛЯ. Надакучыла, што нас не лічаць за сапраўдных лётчыкаў!

ЖЭНЯ. У афіцыянткі ці прачкі перавядуць — лягчэй будзе?

ВАЛЯ. Не трэба так, Жэка. Сама параўнай, што брацікам даручаюць, а што нам.

ЖЭНЯ. Вы надзвычай добра ведаеце, штурман Галубовіч, што камандаванне вырашыла паступова прывучаць жаночае папаўненне часці да складаных баявых дзеянняў. Але вы піжонка і хвалько. Вашым таварышам сорамна перад камандаваннем за вас.

ВАЛЯ. Дазволіце ісці?

ЖЭНЯ. А ведаеш... ведаеш, як мы тут усе... Паўлік мне гаворыць: «У іх бензіну засталося на шэсць мінут», — а сам белы-белы...

ВАЛЯ. Дазваляю вам, таварыш старшы лейтэнант, надалей гэтак па мне не хвалявацца.

ЖЭНЯ. Валюшак..

ВАЛЯ. Не Валюшак, а старшы сержант Галубовіч!

ЖЭНЯ. Валюшак, не трэба...

ВАЛЯ. Дазволіце ісці?

ЖЭНЯ. Ну, уяві сабе, што я — гэта ты. Як бы ты трымалася на маім месцы?

ВАЛЯ. На тваім? Трымалася б! На тваім трымацца лёгка. Ужо ў школе — чэмпіён, парашутыстка, лётчыца. У газетах партрэты, на вітрынах партрэты. Хлопцы паміраюць, дзяўчаты зайздросцяць. А вось ты стань на маё! Думаеш, не знаю, што вы называлі мяне паміж сабой Піпін Кароткі?

ЖЭНЯ. Дзівачка, мы ж без насмешкі, любячы!

ВАЛЯ. Я заўсёды аднаму Паўліку і падабалася. Віцька Лемяшонак не лічыцца, Віцька толькі, каб табе дасадзіць, танцаваў са мной на выпускным. А Паўлік—ён харошы, але ён, калі ўхажвае, усе толькі пасмейваюцца. Збіраемся пагуляць, а мама яго просіць, каб у парк не ішлі. Вецер там моцны з ракі і хуліганы. Ну які гэта кавалер, калі мама просіць наконт хуліганаў!.. Я павінна, разумееш, павінна даказаць табе і ўсім, што я не Піпін Кароткі!..

ЖЭНЯ. Не трэба так пра Паўліка, Валюшак. Знаеш, ён многім па-сапраўднаму падабаецца.

ВАЛЯ. Ах, які ў вас, таварыш старшы лейтэнант, паблажлівы тон! Прыгажун-лебедзь размаўляе з брыдкім качанём! Канечне, ваша ж імя азначае «высакародная»! Дык вось, прыгажун-лебедзь, можаце мне зайздросціць. Хоць камандзір і абураўся, а ўсё роўна прадставіць нас з Сімай да ўзнагароды. Брацікі нам адразу, як мы селі, сказалі, што за такі палёт прадстаўляюць да Чырвонай Зоркі. Так што яшчэ не вядома, хто з нас брыдкае качаня, а хто прыгажун-лебедзь! І лайся колькі хочаш, я ўсё роўна буду рабіць па-свойму.

Пачынае энергічна рабіць ужо знаёмую нам серыю спартыўных практыкаванняў

ЖЭНЯ *(вельмі спакойна).* Сяржант Галубовіч, станьце, як належыць перад старшым па званні... А цяпер ідзіце ў штаб і далажыце дзяжурчаму, што вы пасаджаны на гаўптвахту. Кру-гом!

Ускраіна лесу. Павел і Расціслаў.

РАСЦІСЛАЎ. Жэка не заблудзіць?

ПАВЕЛ. Кожны год сюды прыязджаем.

РАСЦІСЛАЎ. Зарупілі ёй тыя кветкі! Пасядзела б з намі. Не так часта збіраемся.

ПАВЕЛ. Зараз падыдзе. Тут ля рэчкі лотаць дужа пышная. Жэка заўсёды дачцы прывозіць. Кажа: «Гэта табе ад нашага Валюшка».

РАСЦІСЛАЎ. Стары, я вельмі шчаслівы, што сёлета магу, нарэшце, у гэты дзень быць з вамі.

ПАВЕЛ. Я таксама рады. І Жэка. Апошні раз ты быў з намі дзесяць гадоў назад.

РАСЦІСЛАЎ. Летам я вельмі загружаны. Гастролі, выязныя, здымкі. От, калі ласка, тэлеграму ўчора атрымаў. Чытай подпіс.

ПАВЕЛ. Той самы?

РАСЦІСЛАЎ. А то ж! Народны СССР, тры лаўрэацкія значкі, прэмія ў Карлавых Варах.

ПАВЕЛ. Віншую.

РАСЦІСЛАЎ. Знаеш, якія зубры прасіліся на ролю! А выбраў — мяне!

ПАВЕЛ. Выходзіць, і ты зубр.

РАСЦІСЛАЎ. А што ж. Такое-сякое імя ёсць. І да звання прадставілі.

ПАВЕЛ. Цікавую работу прапануе?

РАСЦІСЛАЎ. Не сказаць, каб дужа. Але ў такога, як ён, здымацца — вярняк.

ПАВЕЛ. Нясмачнае слова — «вярняк».

РАСЦІСЛАЎ. І я так калісьці думаў. А цяпер—шыш. Хачу, каб глядач мяне бачыў. І каб дзяўчаты пісьмы пісалі. Хоць жонка ад тых пісем зелянее.

ПАВЕЛ. Але карціны гэты твой *(ківае на тэлеграму)* здымае апошнім часам... паскудныя!

РАСЦІСЛАЎ. А хоць адну крытыкавалі? То-та!

ПАВЕЛ. Цяпер, па-мойму, маладыя ў кіно вельмі цікавыя.

РАСЦІСЛАЎ. Трапляюцца. Адзін юны геній запрашаў мяне. Ролька ніштаватая, але сцэнарый рызыкоўны. А мне не дваццаць гадоў, каб здымацца ў фільме, які могуць пакласці на паліцу... Даўно я цябе, старац, у тэатры не сустракаў.

ПАВЕЛ. Бываю.

РАСЦІСЛАЎ. Апошнюю нашу прэм'еру бачыў?

ПАВЕЛ. Ты мне спадабаўся.

РАСЦІСЛАЎ. Чаго ж не зайшоў, не сказаў?

ПАВЕЛ. Не люблю я — за кулісы хадзіць і ўсё такое.

РАСЦІСЛАЎ. Мог пазваніць. Ды і дома ў сябе я, між іншым, даўнавата цябе не бачыў. Зазнаёмся, таварыш магістр!

ПАВЕЛ. Проста таксама заняты.

РАСЦІСЛАЎ. Ведаю. Газеты чытаю ўважліва. Па тэлебачанні, праўда, не бачыў цябе, але жонка казала — выглядаў ты салідна.

ПАВЕЛ. Пена ўсё гэта — і газеты, і тэлебачанне. І калі тое было!

РАСЦІСЛАЎ. Я, брат, дужа за цябе ўзрадаваўся, як убачыў той артыкул. Якраз на выязны мы ехалі, дык я ў аўтобусе ўголас яго ўсім прачытаў. От, кажу, таварышы, у каго трэба настойлівасці вучыцца: дваццаць гадоў чалавек ідэю прабіваў—і такі прабіў! Перашкаджалі яму, не прызнавалі, смяяліся — а ён усё роўна стаяў на сваім.

ПАВЕЛ. Урачыста задужа гаворыш. Як вершы чытаеш.

РАСЦІСЛАЎ. А аўтар артыкула хто — сам акадэмік Рыбачук! І як напісаў — не артыкул, а мемуары!

ПАВЕЛ. Акадэмікі таксама бываюць чуллівыя. Прытым зарана.

РАСЦІСЛАЎ. Не прыбядняйся. Яшчэ можа стацца — лаўрэата адхопіш!

ПАВЕЛ. Дзірку ўжо для значка ў пінжаку пракруціў.

РАСЦІСЛАЎ. Хоць руку тады падаваць будзеш?

ПАВЕЛ. Палец. Ну табе ўжо так і быць — два.

РАСЦІСЛАЎ. От тады ўжо і я адважуся на мемуары. Пачну іх так: «Мы пазнаёміліся ў гарачую ліпеньскую ноч тысяча дзевяцьсот сорак другога года. Будучы лаўрэат стаяў на пасту ля гаўптвахты».

ПАВЕЛ *(сур'ёзна).* Успаміны такі напішы. Патрэбная рэч. Не пра таго, вядома, хто гаўптвахту вартаваў, а пра таго, хто на гаўптвахце сядзеў.

КАМСАМОЛЬЦЫ ШАСЦІДЗЕСЯТЫХ—ПРА КАМСАМОЛЬЦАЎ ДВАЦЦАТЫХ

Тэатр юнага гледача Дома культуры мінскіх аўтазаводцаў 50-годдзе Ленінскага камсамола адзначыў прэм'ерай па п'есе Барыса Гарбатава «Юнацтва бацькоў». Ставіў гэты спектакль выпускнік рэжысёрскага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута Л. Арэхоўскі, мастацкае афармленне Г. Івакіна. Галоўныя ролі ў спектаклі выконваюць рабочыя А. Варабей, А. Ігнатовіч, М. Напрыенка, Г. Шкуратаў, студэнты Л. Дмітрыева, Т. Гарэлік, В. Стамбурскі і іншыя.

Фота Х. ГРЫГОР'ЕВА.

ПРАЗ ГАДЫ, ПРАЗ ЖЫЦЦЁ...

Сорак гадоў аддзяляюць гэтыя фатаграфіі. Сорак гадоў...

Мы іншы раз гаворым: «новае пакаленне», «другое пакаленне» так, нібы адно ад другога пакаленні аддзелены стагоддзямі. Але ж у жыцці інакш. Праходзіць шэсць-восем гадоў, і пакаленне ўжо новае. Мне не раз даводзілася чуць, як студэнты II—III курсаў са здзіўленнем «адкрывалі» для сябе «незразумелых» васьмі- і дзесяцікласнікаў. А тут—сорак гадоў, вялікі ўсё-такі тэрмін. І калі ў мяне пытаюцца, як жылі мы тады, калі былі маладыя, і ці падабаецца мне сучасная моладзь, я адказваю: «Мы жылі інакш, і сённяшняе пакаленне іншае, і гэта нармальна».

Яны збіраюцца разам часта — сённяшнія камсамольцы тэатра і сакратар партыйнага бюро А. Шэлег.

Фота С. КОХАНА.

Як жа жылі мы? Мы, каму давялося вучыцца ў студыі тэатра імя Якуба Коласа, мы, каму давялося «пачынаць» наш тэатр?

Спачатку некалькі слоў аб тых, хто на старым фота. Яно зроблена ў 1929 годзе. Хлопцы, што сядзяць на ім, называліся камсамольскай ячэйкай Другога беларускага тэатра. У сярэдзіне з газетай Валодзя Стэльмах — наш сакратар. Цяпер ён заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Некаторых ужо няма. Загінуў на фронце абаяльны Абраша Ягудкін (на фота сядзіць справа), памёр ад скарацечных сухотаў у 1931 годзе А. Загавалка (стаіць уверсе справа), памёр А. Гарэлаў (першы злева), Іосіф Антонавіч Матусевіч (другі справа) і я (стаю злева) па сённяшні дзень верныя свайму тэатру. На жаль, я нічога не ведаю аб лёсе Г. Гельмана (другі злева).

Я гляджу на фатаграфію і ўспамінаю... Да пары да часу дрэмле памяць на палічках, дрэмле, пакуль аднойчы не раздасца прарэзлівы званок. Званок да ўспамінаў. У галаве яны праносяцца імкліва, хутка, а расказваць пра іх доўга. Таму выбіраю самае, самае...

1926 год. Працаваў тады я ў Мінску рознарабочым, а потым арматуршчыкам на будаўніцтве. Назаўсёды засталася ў памяці «кадр» прыёму ў камсамол. Да драбніц памятаю гэты цёплы ліпеньскі дзень. Прыём праходзіў вельмі ўрачыста. Нас было адзінаццаць навічкоў-камсамольцаў. Помню наіўны і смешны, трапяткі наш шумавы аркестр. Ніколі не забуду, як мы спявалі: «Смело мы в бой пойдем за власть Советов, и как один умрем в борьбе за это». І гэта была не проста песня, гэта была песня нашых сэрцаў, песня-праграма. Інакш, чым у гэтай песні, мы жыцця сабе не ўяўлялі.

1929 год. Працую ў Мінску па вуліцы Камсамольскай, на будаўніцтве 33-кватэрнага дома. У абед прыносяць газету «Чырвоная змена», чытаю: «Другі Беларускі дзяржаўны тэатр аб'яўляе набор у тэатральную студыю тэрмінам на тры гады». Сэрца так калоціцца, што баюся — вось-вось выскачыць. Вельмі хочацца вучыцца. Але якія шанцы трапіць, калі прымаюць усяго чатырох. Потым ужо я даведаўся, што заяў было 180. 45 чалавек на месца! Ці мог я спадзявацца на што-небудзь? І вось—вынікі. Артыст тэатра В. Бялінскі чытае загад аб залічэнні ў студыю Буцько, Загавалкі, Сакалова і мяне.

15 кастрычніка 1929 года пачынаецца «новая эра» ў маім жыцці — вучоба ў студыі. Знаёмства з артыстамі, якія заўсёды здаваліся мне людзьмі незвычайнымі і цікавымі. Адразу ж уключаюся ў грамадскую работу. Пры камсамольскай ячэйцы была створана канцэртная група, задача якой заключалася ў папулярызацыі тэатра.

1930 год. Гарадскі камітэт камсамола накіроўвае Ягудкіна, Гарэлава, Матусевіча і мяне ў Мікалаеўскі сельсавет арганізоўваць калгасы. Трэба сказаць, што ні ад якой справы не адмаўляліся, бо лічылі для сябе за вялікі гонар давер таварышаў, давер старэйшых. Успамінаю, як сабраліся мы ўвечары ў вёсцы ля газнічкі, раптам — трэск выбітай шыбы і адразу ж ахоплены полымем стол і абрус. Гэта падкулачнікі, якія супрацьўляліся арганізацыі калгасаў, усяляк імкнуліся пазбавіцца ад нас. Але такіх, як мы, былі дзесяткі тысяч...

На другім фота — сённяшнія камсамольцы нашага тэатра. Толькі што закончылася абмеркаванне п'есы, якая будзе пастаўлена сіламі моладзі. Настрой цудоўны — гэта вы бачыце.

Мне, як сакратару партыйнай арганізацыі, больш чым іншым даводзіцца бываць з маладымі артыстамі. Я ведаю іх імкненні і інтарэсы, іх мары і надзеі. Мяне радуюць іх сур'ёзнасць і дзелавітасць. Мне падабаюцца іх танцы і песні. Я рады, што разруха, голад, вайна не выпалі на іх долю. Трэба сказаць, што камсамольцы тэатра вядуць у нашым горадзе, у нашай вобласці вялікую прапагандысцкую і выхаваўчую работу. Яны выязджаюць у калгасы і саўгасы, тыя самыя калгасы і саўгасы, у якіх закладзена драбінка і нашай працы. Задача маладых артыстаў сёння можа і лягчэйшая — кансультаваць драматычныя гурткі, народныя тэатры, калектывы мастацкай самадзейнасці. Але робяць яны гэта натхнёна, з поўнай аддачай творчых сіл.

Тэатральныя канферэнцыі, дыспуты, абмеркаванні спектакляў сталі прывычнымі ў кожным тэатры. Мы не задавальняемся толькі такімі формамі работы. Нашы камсамольцы рыхтуюць цікавыя паэтычныя вечары ў кафэ, школах, на прадпрыемствах. З імі ахвотна сустракаюцца школьнікі. На такіх сустрэчах маладыя артысты расказваюць аб тэатральным мастацтве, аб нашым тэатры, вучаць юных «глядзецаў» спектаклі і, такім чынам, рыхтуюць свайго гледача, што вельмі адказна і важна. Мне запомнілася абмеркаванне спектакля па п'есе Н. Далінінай «Яны і мы». Такому цікаваму абмеркаванню нямала садзейнічалі нашы актывісты-камсамольцы.

І вось так, дапытліва, з юнацкім запалам і добрай заклапочанасцю, ставяцца да тэатральнай справы—справы нашага жыцця — камсамольцы новых і новых пакаленняў, пераймаючы эстафету ад сваіх старэйшых таварышаў. Дух таварыства аб'ядноўвае ўсіх нас, садзейнічае творчаму росквіту тэатра.

Анатоль ШЭЛЕГ,
народны артыст БССР, сакратар партыйнага бюро тэатра імя Я. Коласа.

У КАМІСІІ

ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЯХ БССР

24 кастрычніка адбылося чарговае пасяджэнне Камісіі па Дзяржаўных прэміях БССР. Абмеркаваўшы просьбу Саюза пісьменнікаў БССР аб дадатковым вылучэнні твораў сучаснай беларускай літаратуры на атрыманне Дзяржаўных прэмій БССР, камісія пастанавіла ўключыць у спіс прэтэндэнтаў на прэміі 1968 года раман Міхася Лынькова «Векапомныя дні», які ў ногай рэдакцыі выдадзен у 4-томным Зборы твораў пісьменніка.

ПАПРАЎКА

У нумары нашай газеты за 22 кастрычніка г. г. быў змешчаны артыкул М. Іаўчука «Кастрычніцкая рэвалюцыя і ленінская палітыка савецкай культуры», атрыманы рэдакцыяй ад Агенцтва друку Навіны. Пасля апублікавання артыкула з АДН было прыслана ўдакладненне да яго. Паводле гэтага ўдакладнення чацвёрты абзац артыкула трэба чытаць у наступнай рэдакцыі:

«Ля вытокаў сацыялістычнай культуры стаіць Ленін. Ён здолеў закласці асновы новай палітыкі культуры і навучыць савецкіх людзей пасля рэвалюцыі ўжываць яе ў розных сферах духоўнага жыцця, таму што сам Ленін быў бліскучым знаўцам сусветнай культуры, цанітелем яе класічнай спадчыны і творцам новых духоўных каштоўнасцей. Гэтаму спрыялі надзвычай шырокі інтэлектуальны дыяпазон і глыбіня духоўнай творчасці заснавальніка Савецкай дзяржавы, яго глыбокая перакананасць у тым, што народ, вызвалены ад прыгнёту капіталізму, ва ўмовах сацыялістычнага развіцця «здольны стварыць прыгажосць, якая бязмерна пераўзыходзіць усё, аб чым маглі марыць толькі ў мінулым».

ТЭЛЕБАЧАННЕ

29 кастрычніка

Першая праграма

9-30 — тэлебачанне — школе. Фізіка. 10-ы клас. «Прырода электрычнага току ў электралітах». 14-20 — «Навіны». 14-30 — праграма перадач. 14-35 — «Па камсамолу раўняем крок». Рапарт піянеры Масквы ў гонар 50-годдзя ВЛКСМ (М). 14-50 — маніфестацыя моладзі, прысвечаная 50-годдзю ВЛКСМ. Рэпартаж з Краснай плошчы (М). 16-10 — тэлевізійныя навіны (М). 16-20 — у эфіры—«Маладосць». «Мы—камсамолія» (М) 16-25 — літаратурны тэатр. «Партбілет № 0982900». «Адзін дзень М. Астроўскага» (М). 17-05 — «Камсамол — Радзіме» (М). 18-30 — у эфіры — «Маладосць». «Мы — камсамолія» (М). 18-35 — «Вясельная званы». Тэлевізійны мастацкі фільм (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-10 — у эфіры — «Маладосць». «Мы — камсамолія» (М). 21-15 — маладзёжны фестываль мастацтваў. Заключны тур (М). 23-30 — «Толькі факты». Праграма перадач.

Другая праграма

19-00 — да 50-годдзя ВЛКСМ. «50 ударных дзён». Фотарэпартаж з Мінскага аўтамабільнага завода. 19-25 — дзіцячы экран. «Мы гуляем у тэлефон». Лялечны фільм 19-45 — «Крылы Кастрычніка» Дакументальны фільм. 20-35 — да 50-годдзя ВЛКСМ. «Яны былі першыя». Мастацкі фільм.

30 кастрычніка

Першая праграма

9-30 — тэлебачанне — школе. Хімія. 10-ы клас. «Тэорыя будовы арганічных злучэнняў». 10-05 — тэлевізійныя навіны 10-15 — фестываль фільмаў, прысвечаны 50-годдзю ВЛКСМ. «Я крочу па Маскве» (М). 11-30 — «Па камсамолу раўняем крок». Рапарт піянеры Грузіі ў гонар 50-годдзя ВЛКСМ. 11-45 — для школьнікаў «Расказы аб выяўленчым мастацтве». «Гравюра» (М). 12-15 — для школьнікаў. «Конкурс пяці мільёнаў». Перадача з Польшчы. 15-45 — «Навіны». 15-55 — праграма перадач. 16-00 — для школьнікаў. На прыз ЦК ВЛКСМ. «Надзея». Футбол Перадача з Сочы. У перапынку — «Навіны». 17-30 — школьная фільматэка. «Рэвізор». Мастацкі фільм. 19-45 — «Турнір дапытлівых». 20-15 — «За фасадам «свабоднага свету». «Ілюзіі і факты». Гутарка кандыдата гістарычных навук В. І. Боўшы 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — «Экран і час». Выпуск кінаальманаха прысвячаецца 50-годдзю ВЛКСМ. 22-15 — «У свеце танца». Тэлечасопіс. 23-00 — «Толькі факты». Праграма перадач. 23-10 — для студэнтаў вну. «Начартальная геаметрыя». 23-40 — для студэнтаў вну. 1-ы курс. «Вышэйшая матэматыка».

Другая праграма

17-30 — тэлевізійныя навіны (М). 17-45 — «Музычны турнір гарадоў» (М). 18-30 — «Стандартызацыя і прагрэс» (М). 19-00 — праграма каляровага тэлебачання (М). 20-30 — «Час, які з намі». Дакументальны фільм. 21-15 — праграма Магаданскай студыі тэлебачання (М). 22-45 — «Калыска таленту». Да 150-годдзя з дня нараджэння І. С. Тургенева (М).

31 кастрычніка

Першая праграма

10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — «Радасць творчасці». Тэленарыс (М). 11-15 — «Па камсамолу раўняем крок». Рапарт піянеры Казахстана ў гонар 50-годдзя ВЛКСМ. Перадача з Алма-Аты. 11-30 — «Табе, юнацтва!» Перадача з Ленінграда. 16-45 — «Навіны». 16-55 — праграма перадач. 17-00 — для школьнікаў. «Вялікія фізікі свету», «Вучоныя сярэдневякоўя». Навукова-пазнавальная перадача. 17-30 — трыбуна прапагандыста. «Лектар і аўдыторыя». Гутарка кандыдата філалагічных навук А Міхневіча. 17-50 — дзіцячы экран «Тайна далёкага вострава». Мультыплікацыйны фільм. 18-20 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Казкі бабулі Арыны». 18-45 — «Навіны». 18-55 — «Грамадства і закон». Тэлечасопіс. 19-30 — Першынство СССР па футболу. «Тарпеда» (Масква) — «Спартак» (Масква) (М) У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 21-15 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-45 — «Паводка». Мастацкі фільм (МНР) (М). 23-00 — «Толькі факты». Праграма перадач. 23-10 — для студэнтаў вну. «Тэхналогія металаў». 23-40 — для студэнтаў вну. 3-ці курс. «Вышэйшая матэматыка».

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19 тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намеснік галоўнага рэдактара —3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі—3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі—3-24-62, аддзела публіцыстыкі—3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04 аддзела інфармацыі—3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 02453